Газета Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта www.gazeta.bsu.by

# УНІВЕРСІТЭТ

Пераможца V Нацыянальнага конкурсу друкаваных СМІ «Залатая літара» ў намінацыі «Найлепшая шматтыражная газета»

9 кастрычніка 2015 года, № 15 (2139)

## У нумары:

**ВЫНІКІ ПРАЦЫ БДУ Ў 2011–2015 гг. І ПЕРСПЕКТЫВЫ НА 2016–2020 гг.**
З даклада рэктара акадэміка Сяргея АБЛАМЕЙКІ
Стар. 2–3

**ДВАЦЦАЦЬ ГОД У МІЖНАРОДНАЙ ПОВЯЗІ**
Факультэт міжнародных адносін адсвяткаваў 20-годдзе
Стар. 4

**ЯК ВЫВУЧЫЦЬ КІТАЙСКІЯ ІЕРОГЛІФЫ?**
Выкладчыца журфака Дар'я ГІРГЕЛЬ два гады працавала ў Хэнанскім універсітэце
Стар. 6

РЭЙТЫНГІ

# Новае вымярэнне

**БДУ стаў адзінай айчыннай ВНУ,** якая за ўсю 12-гадовую гісторыю рэйтынгу ўвайшла ў лік ранжыраваных універсітэтаў, і заняў месца ў групе 601-800.




Рэйтынг THE World University Rankings лічыцца адным з найбольш прэстыжных і надзейных рэйтынгаў універсітэтаў свету, выдаецца вядомым брытанскім часопісам Times Higher Education, які спецыялізуецца на пытаннях сферы вышэйшай адукацыі. Раней THE выдаваўся ў супрацоўніцтве з агенцтвам QS, а з 2010 года стаў публікаваць уласны рэйтынг у партнёрстве з агенцтвам Thomson Reuters.

У рэйтынг THE 2015-2016 года ўключаны вынікі ацэнкі 800 найлепшых універсітэтаў свету. Сярод ацэньваных крытэрыяў вылучаюцца наступныя блокі: адукацыйная дзейнасць – 30%, навуковыя даследаванні – 30%, цытаванасць – 30%, міжнароднае супрацоўніцтва – 7,5%, інвестыцыі бізнесу ў навуковую дзейнасць – 2,5%. Важнае значэнне ў методыцы мае акадэмічная і даследчая рэпутацыя ўніверсітэта (па дадзеных апытанняў больш як 11 тысяч экспертаў). Улічваюцца таксама суадносіны студэнтаў і выкладчыкаў, падрыхтоўка кадраў вышэйшай кваліфікацыі (кандыдатаў і дактароў навук), цытаванасць навуковых прац супрацоўнікаў і шматлікія іншыя параметры.

Рэдактар рэйтынгу THE Філ Бэйці адзначыў: «Рэйтынг Times Higher Education World University Rankings, які публікуецца на працягу 12 гадоў, заўсёды рупліва падыходзіць да стандартаў ацэнкі і ўжывае адзіныя цвёрдыя нормы ацэнкі ўніверсітэтаў па ўсім свеце, іх падыходаў да навучання, даследчай і навуковай дзейнасці, міжнароднага супрацоўніцтва. Вынікам нашага рэйтынгу давяраюць студэнты і іх бацькі, прадстаўнікі акадэмічнай сферы, кіраўніцтва ўстаноў вышэйшай адукацыі і міністэрстваў. Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, які ўпершыню заняў месца ў групе 601-800 найлепшых універсітэтаў свету, можа ганарыцца сваімі выбітнымі дасягненнямі».

На верхнім радку рэйтынгу размясціўся Каліфарнійскі інстытут тэхналогій, за ім стаіць Оксфардскі ўніверсітэт, замыкае тройку Стэнфардскі ўніверсітэт.

З краін-суседзяў Беларусі ў рэйтынгу THE 2015-2016 года вышэй за БДУ размясціліся толькі восем расійскіх ВНУ: МДУ (161 пазіцыя), Санкт-Пецярбургскі дзяржаўны політэхнічны ўніверсітэт Пятра Вялікага (201-250), Томскі політэхнічны ўніверсітэт (251-300), Казанскі федэральны ўніверсітэт (251-300), Нацыянальны даследчы ядзерны ўніверсітэт МІФІ (301-350), Новасібірскі дзяржаўны ўніверсітэт (401-500), Санкт-Пецярбургскі дзяржаўны ўніверсітэт (401-500), Маскоўскі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт імя Баўмана (501-600), а таксама Варшаўскі ўніверсітэт (Польшча) (501-600).

**Паводле інфармацыі прэс-службы**

ВЫСТАВЫ

# Акно ў Еўропу

**Распрацоўкі БДУ былі прадстаўлены на Днях беларускай навукі,** арганізаваных 29 і 30 верасня ў межах Сусветнай выставы EXPO-2015 у Мілане (Італія).






??????????????????????????????

У нацыянальным павільёне дэманстраваліся дасягненні і патэнцыял айчыннай навукі. Адным з мерапрыемстваў стаў форум «Перспектыўныя кірункі даследаванняў у Рэспубліцы Беларусь для забеспячэння харчовай бяспекі і паляпшэння якасці жыцця». У яго кантэксце выступіў прарэктар па навуковай працы БДУ акадэмік *Алег Івашкевіч* з прэзентацыяй навукова-тэхнічнай прадукцыі комплексу вядучай ВНУ Беларусі. Пасля вяртання Алег Анатольевіч падзяліўся з намі сваімі ўражаннямі:

– Сусветная выстава – гэта канешне грандыёзнае мерапрыемства, дзе амаль кожная краіна ладзіць сваю экспазіцыю. Сёлета яна прысвячалася пытанням экалогіі, якасці прадуктаў харчавання, медыцыне і біябяспецы. Некаторыя краіны групаваліся па асобных накірунках, напрыклад прадстаўлялі толькі сельскагаспадарчую прадукцыю, як той жа Ізраіль. Беларусь вельмі годна выглядала на фоне іншых. Уявіце сабе – павільен у выглядзе зялёнай гары, раздзеленай пасярэдзіне колам жыцця з імітацыяй вадаспаду, прычым, што цікава – засажанай сапраўдным зялёным лукам.

***– Насамрэч, вельмі арыгінальна…***

– Нездарма праз наш павільен ішла вялікая плыня народа. Тысячы людзей сем'ямі пазнаёміліся з нашай краінай. Да таго якраз 29 верасня быў адкрыты дзень для дзяцей, якіх падвозілі з усёй Італіі, так што было вельмі страката і гамànліва.

***– Што да практычнай дзейнасці?***

– У межах ЭКСПА-2015 на працягу двух дзён мы праводзілі Дні беларускай навукі. Прадстаўнікі акадэмічнай і вузаўскай навукі, аховы здароўя і аграпрамысловага комплексу на чале са старшынёй ДКНТ Аляксандрам Шумілінымым падрыхтавалі 17 выступленняў. У тым ліку зрабіў два даклады і я ад БДУ. Першы даклад тычыўся тэхналогіі атрымання ядомых плёнак для упакоўкі харчовых прадуктаў. Гэта выключна ўнікальная распрацоўка. Мы прадэманстравалі экалагічная бяспечныя, біяразлагальныя ўзоры упаковак, якія італьянскія спецыялісты з задавальненнем паспрабавалі. І другі даклад быў па ачыстцы вады. Таксама вядомая наша тэхналогія.

***– Алег Анатольевіч, якія, на Ваш погляд, перспектывы нашых распрацовак на еўрапейскім рынку?***

– Варта адзначыць, што ў італьянцаў нашы экспанаты выклікалі няштучную цікавасць, яны не чакалі што ім прапануюць распрацоўкі такога ўзроўню. Далей ужо пойдзе канкрэтная праца са спецыялістамі. На нашай прэзентацыі прысутнічалі рэдактары навуковых часопісаў, якіх адмыслова запрасілі, і мы разлічваем, што пасля выхаду публікацый пачнуць усталёўвацца прамыя кантакты.

**Сяргей ШАФАЛОВІЧ**

# Весткі з рэктарата

**ПАДЗЯКА** Прэзідэнта Беларусі аб'яўлена прарэктару па адміністрацыйна-гаспадарчай рабоце *Уладзіміру Рагавіцкаму* за шматгадовую працу, высокі прафесіяналізм, значны ўклад у развіццё матэрыяльна-тэхнічнай базы БДУ.

**РЭКТАРУ БДУ** акадэміку *Сяргею Абламейку* абвешчана падзяка міністра адукацыі Беларусі за добрасумленную працу, значны ўнёсак у развіццё вышэйшай адукацыі.

**ГАНАРОВАЙ** граматай Савета Міністраў РБ узнагароджаны ганаровы дырэктар НДІ ядзерных праблем БДУ *Уладзімір Барышэўскі* за шматгадовую працу, значны ўнёсак у развіццё навукі і адукацыі. Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу РБ за шматгадовую навукова-педагагічную дзейнасць, вялікі ўнёсак у рэалізацыю сацыяльнай і эканамічнай палітыкі Беларусі адзначана прафесар юрыдычнага факультэта *Тамара Макарава.* Падзяка рэктара БДУ з уручэннем каштоўнага падарунка абвешчана за шматгадовую дзейнасць і ў сувязі з 70-годдзем прафесару ФРКТ *Фадзею Камарову.* Ганаровая грамата Міністэрства адукацыі Беларусі ўручана дырэктару НДІ ППМІ БДУ *Юрыю Харыну* за шматгадовую дзейнасць, а таксама за паспяховае кіраўніцтва навуковымі працамі студэнтаў.

**ЗНІЖКІ** на навучанне атрымалі 510 студэнтаў і навучэнцаў і 36 цалкам пераведзены на бюджэтную форму ў 2015-2016 навуч. г. у БДУ. Упершыню сёлета аплата зніжана для шасці студэнтаў з ліку замежных грамадзян.

Найбольшую колькасць «бонусаў» пры аплаце за вучобу атрымалі студэнты ФМА, ІБМТ, ДІКСТ – 226, 108 і 37 адпаведна. Памер зніжак пры аплаце за навучанне даходзіць да 60%. Зніжана аплата тым студэнтам, якія паказалі высокія вынікі пры здачы сесіі і вялі даследчую і грамадскую працу.

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

# Вынікі працы БДУ ў 2011–2015 гг.

З даклада рэктара БДУ акадэміка **Сяргея Абламейкі** на пашыраным пасяджэнні Савета БДУ 28 верасня 2015 г.

Калектыў комплексу БДУ ў 2011–2015 гг. працаваў над выкананнем Плана мерапрыемстваў па рэалізацыі Дзяржаўнай праграмы развіцця вышэйшай адукацыі на 2011–2015 гады, Праграмы перспектыўнага развіцця БДУ на 2011–2015 гг., планаў структурных падраздзяленняў.

У аснове стратэгічнага планавання ў справаздачны перыяд знаходзіліся максімальна эфектыўнае выкарыстанне наяўных рэсурсаў для ўдасканалення навучальна-выхаваўчага, навукова-даследчага і вытворчага складнікаў дзейнасці комплексу БДУ, умацаванне сувязяў паміж яго навукова-адукацыйнымі і вытворчымі структурамі.

### НАЙВАЖНЕЙШЫЯ МЕРАПРЫЕМСТВЫ

Увядзенне сістэмы электроннага дакументазвароту дазволіла ўзмацніць кантроль за выкананнем рашэнняў савета, загадаў і распараджэнняў па ўніверсітэце, асобных даручэнняў кіраўніцтва.

У справаздачны перыяд у БДУ, як і ў цэлым у вышэйшай школе, праводзіліся мерапрыемствы па рэалізацыі прынятых нарматыўна-прававых дакументаў у галіне ўдасканалення адукацыйнага і навуковага працэсаў, ідэалагічнай і выхаваўчай працы. Укаранёная *новая канцэпцыя выкладання сацыяльна-гуманітарных дысцыплін*, ажыццёўлены пераход першай ступені вышэйшай адукацыі *на дыферэнцыяваныя тэрміны навучання*, распрацавана і ўкаранёна *новае пакаленне адукацыйных стандартаў і тыпавых навучальных планаў* і навучальных планаў спецыяльнасцяў. Адкрыты *новы від магістратуры* – падрыхтоўка па спецыяльнасцях з паглыбленай падрыхтоўкай спецыялістаў і інш.

### СТРУКТУРА ЎНІВЕРСІТЭТА

Цяпер у складзе адзінага навучальна-навукова-вытворчага комплексу БДУ **26** факультэтаў і адукацыйных установ, **10** навукова-даследчых інстытутаў і цэнтраў, **41** навукова-даследчая лабараторыя на факультэтах, **10** інавацыйна-вытворчых прадпрыемстваў. З пералічаных падраздзяленняў **32** маюць статус юрыдычнай асобы. У 2014/2015 навуч. г. функцыянавалі **93** філіялы кафедраў універсітэта, у папярэднім навучальным годзе – 76.

### ДАСЯГНЕННІ

У 2011 г. БДУ падсумаваў свой унёсак ў сацыяльна-эканамічнае развіццё нашай краіны за 90-гадовы перыяд. У гэтым жа годзе была заснавана *серыя «Класічнае ўніверсітэцкае выданне», стэнд вядомых выпускнікоў і Дошка пашаны супрацоўнікаў БДУ.*

У 2013 г. прысуджана *Дзяржаўная прэмія Рэспублікі Беларусь* за цыкл навуковых прац «Новыя неарганічныя злучэнні і матэрыялы на аснове мікра– і нанапамерных часціц: атрыманне, уласцівасці, ужыванне» акадэмікам ***Івашкевічу А. А., Лесніковічу А. І.*** і доктару хімічных навук ***Арцем'еву М. В.*** Упершыню *Міжнародная прэмія Scopus Award* за публікацыйную актыўнасць і цытаванасць навуковых артыкулаў была прысуджана дзесяці беларускім навукоўцам, 6 з якіх – супрацоўнікі БДУ.

У 2014 г. адзін супрацоўнік універсітэта абраны акадэмікам НАН Беларусі ***(Карзюк В. І.)*** і два – членамі-карэспандэнтамі НАН Беларусі ***(Свірыдаў Д. В., Шкуматаў У. М.)***

НДІ фізіка-хімічных праблем БДУ ў адпаведнасці з указамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у 2011, 2012 і 2013 гг. заносіўся на *Рэспубліканскую дошку пашаны* за першае месца па выніках спаборніцтваў сярод арганізацый навукі і навуковага абслугоўвання *(дырэктар Гаеўская Т. В.).*

### ЗНАЧНЫЯ ПАДЗЕІ

З 2011 г. 9 замежных грамадзян былі ганараваны *звання «Ганаровы прафесар БДУ»* за вялікі ўнёсак у навуку і ўмацаванне сувязяў паміж Рэспублікай Беларусь і сваімі краінамі (3 – КНР, 2 – Расійская Федэрацыя і па адным – Індыя, Пакістан, Таджыкістан, Туркменістан).

У 2012 г. упершыню ў гісторыі БДУ створаны *Прафесарскі сход* з мэтай садзейнічання арганізацыі адукацыйнага працэсу, яго адпаведнасці сучасным запатрабаванням асобы, грамадства і дзяржавы; развіцця фундаментальных і прыкладных навук, інавацыйных распрацовак. Актывізавана праца савета маладых навукоўцаў.

У 2014 г. з мэтай каардынацыі дзейнасці грамадскіх арганізацый і органаў студэнцкага самакіравання, забеспячэння рэалізацыі правоў навучэнцаў на ўдзел у кіраванні адукацыйным працэсам, падтрымкі і рэалізацыі студэнцкіх ініцыятыў, накіраваных на павышэнне аўтарытэту, захавання і прымнажэння традыцый БДУ, заснавана *Студэнцкая асамблея БДУ.*

### СУСВЕТНЫЯ РЭЙТЫНГІ

За справаздачны перыяд БДУ значна палепшыў свае пазіцыі ў сусветных рэйтынгах. Па дадзеных найбольш аўтарытэтных міжнародных рэйтынгавых агенцтваў, ***БДУ ўваходзіць у 2 % найлепшых універсітэтаў свету.***

Па выніках рэйтынгу Webometrics Ranking of World Universities, апублікаваным у ліпені 2015 г., БДУ заняў 609 пазіцыю (у 2010 годзе БДУ быў на 1476 месцы). Сярод ВНУ краін-удзельніц СНД БДУ знаходзіцца на трэцім месцы (наперадзе МДУ імя М. В. Ламаносава і Санкт-Пецярбургскі дзяржаўны ўніверсітэт).

Па выніках брытанскага рэйтынгавага агенцтва QS у 2015/2016 нававуч. г. наш універсітэт дзяліць 421–430 пазіцыі ў сусветным рэйтынгу (у 2010 годзе БДУ нават не разглядаўся гэтым рэйтынгам).

Па дадзеных расійскіх рэйтынгавых агенцтваў «Інтэрфакс» і «Эксперт РА», у 2013 г. БДУ заняў 2 пазіцыю ў рамках СНД пасля МДУ імя М. В. Ламаносава.

БДУ прысутнічае ў асноўных сусветных і рэгіянальных рэйтынгах ВНУ: Webometrics Ranking of World Universities, Ranking Web of Repositories, Ranking of Business Schools, QS, U-Multirank, Scimago Institutions Rankings, 4 international Colleges & Universities, University Ranking by Academic Performance (URAP), «Эксперт РА», «Інтэрфакс» і інш.

### АДУКАЦЫЙНЫ ПРАЦЭС

У комплексе БДУ на ліпень 2015 г. працавалі **8593 чал.** (7586 – асноўныя супрацоўнікі). Колькасць выкладчыкаў – **2733**, навуковых супрацоўнікаў – **507.** 766 выкладчыкаў (28,0 % ад агульнай колькасці) маюць узрост звыш 60 гадоў, да 30 гадоў – 259 (9,5 %).

Штогод у сярэднім на розных узроўнях і формах навучання, уключаючы павышэнне кваліфікацыі і перападрыхтоўку, на ўніверсітэце навучалася каля **41,6 тыс.** чалавек (па плане развіцця – 34,5 тыс. чалавек). За пяць гадоў на першай ступені вышэйшай адукацыі падрыхтаваны 25491 спецыяліст (па плане развіцця – 27085), 3270 магістраў (па плане развіцця – 2775).

На ўсе формы атрымання вышэйшай адукацыі ў 2015 г. залічана **4935 абітурыентаў** (у 2014 г. – 5085), у тым ліку:

- дзённая бюджэтная форма – **2023** пры плане прыёму 2023 , у 2014 г. – 2054 пры плане прыёму 2081;
- дзённая платная форма – **1790** (у 2014 г. – 1828);
- завочная бюджэтная форма – **256** пры плане 270 (у 2014 г. – 286);
- завочная платная форма – **624** (у 2014 г. – 654);
- для атрымання другой вышэйшай адукацыі – **237** (у 2014 г. – 263).

У 2015/2016 навуч. г. падрыхтоўка спецыялістаў на першай ступені вышэйшай адукацыі ажыццяўляецца па **81** спецыяльнасці і **83** напрамках спецыяльнасцяў (у 2014/2015 навуч. г. – па 74 спецыяльнасцях і 78 напрамках спецыяльнасцяў). У магістратуры ў бягучым навучальным годзе вядзецца падрыхтоўка па **78** спецыяльнасцях, у 2014/2015 навуч. г. – па 74.

### ПОСПЕХІ СТУДЭНТАЎ

Высокая якасць адукацыі пацвярджае ўдзел навучэнцаў БДУ ў міжнародных прадметных алімпіядах і конкурсах.

Так, у *Міжнароднай матэматычнай студэнцкай алімпіядзе* БДУ ўдзельнічае з 2001 г. – за гэты перыяд заваявана 37 залатых, 30 сярэбраных і пяць бронзавых медалёў.

У студэнцкім камандным *чэмпіянаце свету па праграмаванні* каманды БДУ ўдзельнічаюць з 1995 г. і дамагаюцца па выніках адборачных тураў права выступаць у фінале ў ліку 100 найлепшых каманд свету. У 2014 годзе каманда БДУ заваявала сярэбраныя медалі.

*Міжнародная ўніверсіяда па біялогіі* праводзіцца з 2012 г. (МДУ імя М. В. Ламаносава, г. Масква) – у БДУ 1 месца ў 2012 г. і 3 месца ў 2014 г.

*Міжнародная хімічная алімпіяда* праводзіцца з 2013 г. (МДУ імя М. В. Ламаносава, г. Масква) – у БДУ ў 2014 г. два залатыя і адзін сярэбраны медалі, у 2015 г. – два сярэбраныя медалі.

Студэнты эканамічнага факультэта заваявалі залаты і два сярэбраныя медалі на II *Міжнародным чэмпіянаце студэнтаў па карпаратыўных фінансах* (МДУ імя М. В. Ламаносава, г. Масква).

Каманда факультэта філасофіі і сацыяльных навук на *Усерасійскім чэмпіянаце па псіхалогіі* заняла тры першыя месцы і адно другое (Вышэйшая школа эканомікі, г.Масква).

На *міжнароднай алімпіядзе па тэарэтычнай механіцы* (БелГУТ, г. Гомель) – у БДУ ў 2013 г. 1 і 3 месцы і першае месца ў камандным заліку, у 2014 г. – першае месца ў камандным заліку.

### АСПІРАНТУРА І ДАКТАРАНТУРА

Падрыхтоўка навуковых працаўнікоў вышэйшай кваліфікацыі праз аспірантуру вядзецца па **126** спецыяльнасцях, праз дактарантуру – па **116.**

За перыяд з 2011 г. па 2014 г. супрацоўнікамі і аспірантамі ўніверсітэта абаронена **25 доктарскіх** і **217 кандыдацкіх дысертацый** (па плане развіцця адпаведна – 26 і 220).

На 01.08.2015 г. у комплексе БДУ навучаліся **22** дактаранты і суіскальнікі доктарскай ступені, **790** аспірантаў/суіскальнікаў з ліку грамадзян Рэспублікі Беларусь, з іх на платнай аснове – 56, замежных аспірантаў – **79.**

### НАВУКОВАЯ СФЕРА

БДУ з'яўляецца галаўной арганізацыяй-выканаўцам **8** з **12** *Дзяржаўных праграм навуковых даследаванняў* на 2011–2015 гг. («Энергабяспека, энергаэфектыўнасць і энергазахаванне, атамная энергетыка», «Хімічныя тэхналогіі і матэрыялы, прыродна-рэсурсавы патэнцыял», «Электроніка і фатоніка», «Функцыянальныя і кампазіцыйныя матэрыялы, нанаматэрыялы», «Інфарматыка і космас, навуковае забеспячэнне бяспекі і абароны ад надзвычайных сітуацый», «Фундаментальныя асновы біятэхналогій», «Канвергенцыя», «Гісторыя, культура, грамадства, дзяржава»).

Штогод навуковыя ўстановы БДУ і яго падраздзяленні ўдзельнічаюць у выкананні **больш за 300 заданняў** *12 дзяржаўных праграм навуковых даследаванняў* у галіне прыродазнаўчых, тэхнічных, гуманітарных і сацыяльных навук.

У 2011–2014 гадах перагляд выданняў штогод складаў каля **1500** найменняў (манаграфіі, падручнікі і навучальныя дапаможнікі, зборнікі навуковых прац, зборнікі тэзісаў дакладаў навуковых канферэнцый і іншыя навуковыя выданні).

На падставе распрацаванага і зацверджанага палажэння пра прэміяванне працаўнікоў структурных падраздзяленняў БДУ за публікацыі ў вядучых міжнародных часопісах за 2012–2014 гады было **прэміявана 115 супрацоўнікаў.** Агульная сума прэмій склала 283,440 млн руб.

Рознымі формамі НДРС за рамкамі навучальных заняткаў










**Выставочная деятельность в 2011-2015 гг.**

**Итоги участия в конкурсе «Лучший инновационный проект и лучшая научно-техническая разработка года» (Петербургская техническая ярмарка):**

| Год | 2011 | 2012 | 2013 | 2014 | 2015 | Итого |
|---|---|---|---|---|---|---|
| *Специальный приз* | - | 1 | 1 | 1 | - | 3 |
| *Золотая медаль* | 3 | 3 | 7 | 6 | 11 | 30 |
| *Серебряная медаль* | 11 | 8 | 8 | 13 | 6 | 46 |
| *Диплом* | 9 | 5 | 8 | 9 | 6 | 37 |



**23 выставки на базе университета**
**125 международных и республиканских выставок**

- Китай
- Япония
- Германия
- Россия
- Малайзия
- Индия
- Иран
- Латвия
- Сербия
- Азербайджан
- Казахстан
- Вьетнам
- Мьянма
- Монголия
- ОАЭ
- Италия
- ЮАР
- Камбоджа
- Болгария

**Призовые места и награды в ежегодных конкурсах**

- Международный конкурс энергоэффективных и ресурсосберегающих технологий и оборудования (Белорусский промышленный форум)
- *Республиканский конкурс инновационных проектов*
- Республиканский конкурс научных работ студентов
- *Республиканский конкурс «ТЕХНОСФЕРА»*

**Проект «Биорассасывающиеся противоопухолевые препараты для локальной химеотерапии злокачественных новообразований Темодекс и Проспиделонг» вошел в десятку лучших научных работ конкурса «100 идей для Беларуси»**

# і перспектывы развіцця на 2016–2020 гг.













за мінулую пяцігодку было абхоплена больш за **41 тысячу студэнтаў,** што складае ў сярэднім 41,4 % ад агульнага ліку студэнтаў дзённай формы навучання. Удзельнічалі ў выкананні планавых дзяржбюджэтных і гасдамоўных НДВКП за пяць гадоў 5811 студэнтаў, у тым ліку 2441 студэнт працаваў на ўмовах аплаты. У СНДЛ і іншых творчых аб'яднаннях працавалі 10064 студэнты. Удзельнічалі ў працах па заданнях дзяржаўных праграм навуковых даследаванняў і навукова-тэхнічных праграм 2467 студэнтаў.

На навуковых канферэнцыях за пяцігодку студэнтамі прачытана 27 268 дакладаў, у тым ліку на міжнародных – 5442, рэспубліканскіх – 3434, іншых – 18392.

На конкурсах і выставах рознага ўзроўню за перыяд 2011–2014 гг. былі адзначаны **1808 прац** (экспанатаў), выкананых з удзелам студэнтаў, з іх 329 – на міжнародным узроўні, 768 – рэспубліканскім.

За пяць гадоў было апублікавана **12767 прац,** аўтарамі (суаўтарамі) якіх з'яўляліся студэнты: 3876 артыкулаў у навуковых часопісах і іншых навуковых выданнях, 7978 тэзісаў дакладаў на канферэнцыях рознага ўзроўню, 913 – электронных публікацый.

У конкурсе грантаў універсітэта для выканання навуковай працы студэнтамі і аспірантамі за пяць гадоў удзельнічалі **222 праекты.** У складзе выканаўцаў грантаў былі заяўлены 351 студэнт, 84 магістранты, 230 аспірантаў. Па выніках конкурсаў грантаў для матэрыяльнага заахвочвання выканаўцаў 130 праектаў было вылучана фінансаванне ў памеры **716 млн руб.**

У конкурсах на суісканне грантаў дактарантамі, аспірантамі, студэнтамі, якія навучаюцца ва ўстановах Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, за пяць гадоў ад БДУ ўдзельнічала 135 праектаў, з якіх фінансаванне атрымалі **100 праектаў.**

На штогадовы *Рэспубліканскі конкурс навуковых прац студэнтаў* БДУ прадставіў за пяць гадоў 1171 працу, з якіх лаўрэатамі сталі **43 працы,** 227 прац атрымалі 1 катэгорыю, 316 прац – 2 і 281 – 3.

Па выніках конкурсаў на найлепшую СНДЛ за пяць гадоў было *прэміявана 78 навуковых кіраўнікоў і 240 удзельнікаў СНДЛ* на агульную суму **288,49 млн руб.** Па выніках конкурсу на найлепшага кіраўніка і арганізатара НДРС за пяць гадоў заахвочаны *134 супрацоўнікі універсітэта.* На фінансаванне камандзіровак студэнтаў на навуковыя канферэнцыі вылучана за пяць гадоў – ***43,3 млн руб. з уласных сродкаў.***

За 2011–2014 гг. **543** навуковыя распрацоўкі БДУ былі скарыстаны ў народнай гаспадарцы і **794** – у навучальным працэсе. За гэты перыяд атрымана **413** станоўчых рашэнняў па заяўках на аб'екты прамысловай уласнасці.

### НАВУКОВА-ТЭХНІЧНАЯ ПРАДУКЦЫЯ

Працягвалі развівацца міжнародныя сувязі ўніверсітэта з замежнымі партнёрамі на аснове выканання дамоў пра навуковае супрацоўніцтва, заключэнне замежнагандлёвых пагадненняў, удзел у праектах міжнародных фондаў і праграм, узаемных стажыровак, прадстаўленне навуковых вынікаў на выставах і канферэнцыях.

У перыяд з 2011 г. па 2015 г. міжнароднае навукова-тэхнічнае супрацоўніцтва ажыццяўлялася штогод у сярэднім па **275** дамовах і дамовах з замежнымі партнёрамі з 40 краін: Расія (у сярэднім у год 76 дамоў), Германія (31 дамова), Польшча (29 дамоў), Украіна (25 дамоў) і г. д. У гэты перыяд БДУ выконваў у год каля **60 праектаў** міжнародных праграм, сярод якіх праграмы і гранты МНТЦ, ІНТАС, 7 РП, ЦЕРН, НАТА, АІЯД, ААН, ДААД, «Вісбі», Tempus і іншыя. Штогод навукоўцы БДУ атрымліваюць **больш за 220 грантаў,** уключаючы гранты на навуковыя стажыроўкі і ўдзел у канферэнцыях.

Сумарны бюджэт установ і падраздзяленняў БДУ, якія выконваюць праекты, за 2011–2014 гг. склаў **7410 тыс. дол. ЗША.** У 2011–2014 гг. выконвалася ў сярэднім у год **87** праектаў БРФФД у рамках сумесных конкурсаў з аналагічнымі фондамі іншых краін – Аўстраліі, Азербайджана, Арменіі, Вялікабрытаніі, В'етнама, Германіі, Грузіі, Іспаніі, Італіі, Казахстана, Кітая, Латвіі, Літвы, Малдовы, Манголіі, Польшчы, Партугаліі, Рэспублікі Карэя, Расіі, Румыніі, Сербіі, ЗША, Украіны, Францыі, Эстоніі. Агульны бюджэт установ і падраздзяленняў БДУ, якія выконваюць праекты, за гэты перыяд склаў суму, эквівалентную **1864 тыс. дол. ЗША.**

У перыяд 2011–2015 гг. установы, падраздзяленні і прадпрыемствы комплексу БДУ, нароўні з выкананнем праграм міжнароднага навуковага супрацоўніцтва, значна актывізавалі працу па прасоўванні навукова-тэхнічнай прадукцыі на вонкавыя рынкі. У выніку выканання **331** кантракта і дамовы з арганізацыямі 32 краін блізкага і далёкага замежжа было вылучана валютных сродкаў на суму, эквівалентную **7545 тыс. дол. ЗША.**

У 2011–2015 гг. **больш за 100 новых распрацовак** супрацоўнікаў БДУ былі прадстаўлены на 109 рэспубліканскіх і міжнародных выставах. На выставах у Расійскай Федэрацыі і Беларусі навукаёмістая прадукцыя БДУ ўзнагароджана 3 спецыяльнымі прызамі, 59 медалямі і 31 адмысловым дыпломам.

### ВЫХАВАЎЧАЯ ПРАЦА І САМАКІРАВАННЕ

У БДУ праводзіцца мэтанакіраваная дзейнасць па арганізацыі ідэалагічнай і выхаваўчай працы, прыцягненні студэнцкіх арганізацый да кіравання ўніверсітэтам. Асноўныя кірункамі ідэалагічнай і выхаваўчай працы ў БДУ з'яўляюцца:

- ідэалагічнае і грамадзянска-патрыятычнае выхаванне;
- маральнае выхаванне;
- выхаванне культуры здаровага ладу жыцця, фізічнае выхаванне;
- гендарнае і сямейнае выхаванне;
- працоўнае і прафесійнае выхаванне;
- экалагічнае выхаванне, выхаванне культуры бяспечнай жыццядзейнасці;
- выхаванне культуры побыту і вольнага часу.

Колькасць студэнтаў, якія прымаюць удзел у дзейнасці моладзевых грамадскіх арганізацый, органаў студэнцкага самакіравання БДУ, у справаздачным перыядзе знаходзіліся ў межах 43-61 % ад агульнага ліку студэнтаў дзённай формы навучання; колькасць студэнтаў, што прымаюць удзел у дзейнасці творчых калектываў, клубаў і гурткоў па інтарэсах – у межах 7,4-9,1 %; колькасць студэнтаў, якія займаюцца ў групах спартыўнага ўдасканалення і маюць спартыўныя разрады і званні – у межах 1400-1450 чалавек. Стварэнне студэнцкай асамблеі БДУ, арганізацыя і правядзенне міжнародных і рэспубліканскіх студэнцкіх форумаў, дзейнасць студэнцкіх арганізацый і органаў студэнцкага самакіравання аказалі істотны ўплыў на далучэнне Рэспублікі Беларусь да Балонскага працэсу.

### УДЗЕЛ У МІЖНАРОДНЫХ АРГАНІЗАЦЫЯХ

БДУ бярэ ўдзел у дзейнасці шэрагу міжнародных арганізацый: Еўрапейская асацыяцыя ўніверсітэтаў (EAU), Еўразійская асацыяцыя ўніверсітэтаў (ЕАУ), Універсітэцкая сетка Цэнтральна-Еўрапейскай ініцыятывы (CEI UniNet), Міжнародная асацыяцыя выкладчыкаў рускай мовы і літаратуры (МАПРЯЛ), Сетка міжнародных цэнтраў рэлятывісцкай астрафізікі (ICRANet), Еўрапейская сетка «Супрацоўніцтва для вышэйшай адукацыі ў галіне радыёлагічнай і ядзернай інжынерыі» (CHERNE), Асацыяцыя школ Цэнтральнай і Усходняй Еўропы па даследаваннях у галіне міжнародных адносін, Міжнародны саюз мытных універсітэтаў INCU, Саюз фізіялагічных грамадстваў краін СНД, Грамадскі палярны савет НАН Беларусі (у рамках Міжнароднай праграмы засваення Антарктыды), Камітэт па навуцы і тэхналогіях Канвенцыі ААН па барацьбе з дэградацыяй земляў.

У 2012 г. па ініцыятыве БДУ і Расійскага дзяржаўнага геолагаразведнага ўніверсітэта імя С. Арджанікідзэ створаны *Беларуска-расійскі цэнтр навук пра зямлю.*

У 2011–2012 гг. створаны *Беларуска-кітайскі інавацыйны цэнтр* і *Беларуска-в'етнамскі інавацыйна-адукацыйны цэнтр.* Складзены кантракты на распрацоўку навукова-тэхнічнай прадукцыі з кітайскімі партнёрамі на агульную суму 330 тыс. дол. ЗША. Беларуска-в'етнамскі інавацыйна-адукацыйны цэнтр штогод праводзіць конкурсы грантаў. За тры гады было прафінансавана 9 праектаў (4 – біяфак, 2 – ФПМІ, 2 – фізфак, 1 – ФДА).

### НАВУЧАННЕ ЗАМЕЖНЫХ ГРАМАДЗЯН

У сярэднім штогод у БДУ на ўсіх узроўнях і формах навучаецца **ад 2000 да 2600** замежных грамадзян. У 2014–2015 навуч. год навучалася з краін СНД 53,3 %, Азіі – 41,8 %, Еўропы – 3,6 %, Афрыкі – 1 %, Паўночнай і Паўднёвай Амерыкі – 0,3 % ад ліку ўсіх замежных студэнтаў.

### ГАСПАДАРЧАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ

Прыбыткі комплексу БДУ ў 2014 г. склалі **1329,6 млрд руб.,** з іх 63 % ад адукацыйнай дзейнасці, 22,5 % – ад вытворчай дзейнасці, 14,5 % – ад навуковай дзейнасці. У 2013 г. агульны прыбытак склаў 1262,6 млрд руб., з іх па відах дзейнасці адпаведна – 60 %, 25 % і 15 %.

Прыбыткі ад *экспарту адукацыйных паслуг* у 2014 г. склалі **7167 тыс. дол. ЗША,** ад пастаўкі *навукова-тэхнічнай прадукцыі* – **2279 тыс. дол. ЗША,** у 2013 г. гэтыя паказчыкі складалі адпаведна 7155 і 2280 тыс. дол. ЗША.

У 2014 г. на *капітальны рамонт* патрачана **3,05 млрд руб. уласных сродкаў** (бюджэтных сродкаў не вылучалася), у 2013 г. – 2,62 млрд руб. уласных сродкаў і 8,32 млрд руб. – бюджэтных. На *бягучы рамонт* у 2014 г. патрачана 2,36 млрд руб. уласных сродкаў і 0,17 млрд руб. – бюджэтных, у 2013 г. адпаведна – 3,88 і 0,52 млрд руб.

*Набыта абсталявання* ў 2014 г. за кошт бюджэту на 24975,7 млн руб., за кошт уласных сродкаў – на 4575,3 млн руб. У 2013 г. гэтыя паказчыкі склалі адпаведна 24540,8 і 5769,5 млн руб.

### ПРА СТРАТЭГІЮ РАЗВІЦЦЯ БДУ Ў 2016–2020 гг.

- Распрацоўка Праграмы развіцця БДУ на 2016–2020 гады
- Распрацоўка праграмы святкавання 100-гадовага юбілею Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта як нацыянальнага свята Рэспублікі Беларусь
- Умацаванне пазіцый універсітэта ў сусветнай навукова-адукацыйнай прасторы. Задача БДУ ў сусветных рэйтынгах у 2016–2020 гг. – упэўнена ўваходзіць у топ-500 найлепшых універсітэтаў свету і ў топ-5 найлепшых універсітэтаў СНД.
- Удасканаленне кіравання ВНУ, кадравага забеспячэння, развіццё сістэмы павышэння кваліфікацыі супрацоўнікаў.
- Узмацненне ўдзелу студэнцкіх і іншых моладзевых арганізацый у прыняцці рашэнняў па ўдасканаленні навучальна-выхаваўчага і навукова-даследчага працэсаў.
- Распрацоўка і ўкараненне на аснове прынятай Канцэпцыі сучасных адукацыйных інфармацыйных і тэлекамунікацыйных тэхналогій, накіраваных на павышэнне якасці падрыхтоўкі спецыялістаў на ўсіх узроўнях.
- Пашырэнне спектру платных адукацыйных паслуг, уключаючы іх экспарт.
- Развіццё інавацыйнай дзейнасці і навуковых даследаванняў, нарошчванне аб'ёмаў выпуску навукаёмістай прадукцыі і яе экспарту.
- Пашырэнне сувязяў з іншымі адукацыйнымі і навуковымі ўстановамі, вытворчасцю.
- Актывізацыя выдавецкай дзейнасці, развіццё Электроннай бібліятэкі БДУ
- Удасканаленне ідэалагічнай і выхаваўчай працы.
- Умацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы.

# Дваццаць год у міжнароднай повязі

**Святочнае мерапрыемства,** прысвечанае 20-годдзю факультэта міжнародных адносін БДУ, адбылося 2 кастрычніка.



*Дэканы БДУ разам з шчырымі віншаваннямі паабяцалі ўсталяваць памятную дошку на гістарычным факультэце ў гонар ФМА*

Урачыстае пасяджэнне пачалося з дэманстрацыі дакументальнага фільма, які коратка распавядаў пра факультэт, яго супрацоўнікаў і кірунні дзейнасці. Затым з вітальным словам выступіў дэкан ФМА ***Віктар Шадурскі.*** Ён надаў увагу вытокам стварэння факультэта, навуковаму патэнцыялу (тут працуюць 19 дактароў і 99 кандыдатаў навук; за 20 гадоў на факультэце было абаронены 72 кандыдацкіх і 11 доктарскіх дысертацый). Асобная ўвага была нададзена будучыні. Віктар Генадзьевіч падкрэсліў, што для выкладчыкаў, супрацоўнікаў і саміх студэнтаў важным застаецца тое, якім будзе факультэт заўтра і як працягваць захоўваць яго прэстыж. Затым дэкан перадаў слова свайму папярэдніку ***Аляксандру Шарапу.***

Аляксандр Віктаравіч правёў маленькі экскурс у гісторыю, успомніў, як усё пачыналася, якую дапамогу ў стварэнні аказалі іншыя факультэты БДУ, розныя арганізацыі і ведамствы. Маладому факультэту трэба было не толькі ўладкоўваць навучальныя памяшканні, але і ствараць сваю навуковую школу. Усе задачы паспяхова вырашаны. Сёння ў сценах факультэта працуюць яго выпускнікі, такім чынам, можна казаць пра пераемнасць і змену пакаленняў.

Рэктар БДУ акадэмік ***Сяргей Абламейка*** адзначыў, што ФМА з'яўляецца адным з маладых факультэтаў універсітэта, але ўжо высока зарэкамендаваў сябе ў краіне і за мяжой, стварыў навуковыя школы. Факультэт стаў пляцоўкай для абмеркавання розных праблем як рэгіянальнага, так і міжнароднага значэння, месцам правядзення мноства канферэнцый, семінараў. ФМА – гэта яшчэ і вельмі высокія прахадныя балы абітурыентаў. Рэктар выказаў упэўненасць, што ў факультэта добрая будучыня.



*Міністр замежных спраў У. Макей ушаноўвае В. Шадурскага*

Павіншаваў факультэт, супрацоўнікаў, студэнтаў з юбілеем. міністр замежных спраў Беларусі ***Уладзімір Макей.*** Ён адзначыў, што 20 гадоў – гэта пакуль не сталасць, але досыць важны момант у жыцці, калі трэба абраць свой шлях. Факультэт гэты шлях абраў і ўпэўнена ідзе наперад. Міністр адзначыў рост прафесіяналізму выпускнікоў, падзякаваў выкладчыкам за добрасумленную працу, а выпускнікам за працавітасць і жаданне прыносіць карысць Радзіме. У завяршэнні ён адзначыў, што многія выпускнікі ФМА займаюць адказныя пасты ў МЗС, запэўніў, што дзверы ведамства заўсёды будуць адкрыты для наступных выпускнікоў, пажадаў новых поспехаў факультэту.

Старшыня пастаяннай камісіі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспекі **Уладзімір Сянько** перадаў вітальны адрас ад старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Міхаіла Мясніковіча. Было сказана, што ФМА ствараўся з мэтай падрыхтоўкі кваліфікаваных кадраў для наладжвання кантактаў з усімі дзяржавамі свету, з чым ён добра справіўся. Многія выпускнікі працуюць як у дзяржаўных органах, так і ў прыватным сектары. Было падкрэслена, што высокі прэстыж факультэта з'яўляецца вынікам працы выкладчыцкага складу. Дэпутат пажадаў факультэту і выпускнікам далейшых творчых поспехаў на карысць краіны.

У віншаванні дэканаў БДУ прагучала абяцанне ўсталяваць памятную таблічку ў першым памяшканні ФМА на гістарычным факультэце БДУ, дзе «пачынаўся факультэт міжнародных адносін». Дэканы адзначылі рост факультэта і пажадалі яму далейшых поспехаў.

Намеснік міністра эканомікі Беларусі **Антон Кудасаў** заявіў, што ганарыцца сваёй спецыяльнасцю – міжнародныя адносіны – і адзначыў карпатлівую працу выкладчыкаў і запатрабаванасць выпускнікоў.

Намеснік міністра юстыцыі Беларусі **Сяргей Задзіран** выказаў спадзяванне, што выпускнікі працягнуць уносіць значны ўклад у росквіт нашай краіны.

Намеснік старшыні Дзяржаўнага мытнага камітэта **Сяргей Полудзень** адзначыў цеснае ўзаемадзеянне ДМК з кафедрай мытнай справы.

Ад імя Міністэрства спорту і турызму выступіла начальнік аддзела маркетынгу і якасці турысцкіх паслуг, выпускніца ФМА, **Юлія Копаць.** Яна выказала словы падзякі выкладчыкам, якія змаглі зрабіць факультэт другім домам для студэнтаў, а таксама ад імя міністэрства ўручыла грамату калектыву ФМА за значны ўнёсак у падрыхтоўку спецыялістаў у турысцкай галіне.

З 20-годдзем ФМА павіншаваў кіраўнік справамі адміністрацыі Маскоўскага раёна г. Мінска **Уладзімір Казлоўскі** ад імя кіраўніка адміністрацыі Аляксандра Крапака. Быў адзначаны прэстыж факультэта, які падтрымліваецца шляхам велізарнай працы выкладчыцкага складу, атрыманае факультэтам прызнанне як у Беларусі, так і за яе межамі, а таксама запатрабаванасць выпускнікоў у дзяржаўных органах, у рэальным сектары эканомікі.

Выкладчыкі і супрацоўнікі факультэта міжнародных адносін былі адзначаны ганаровымі граматамі і падзякамі.

У прамежках паміж выступленнямі афіцыйных асоб прысутныя змаглі пазнаёміцца з канцэртнымі нумарамі, падрыхтаванымі студэнтамі факультэта пры дапамозе студэнцкіх арганізацый. У канцы святочнага канцэрта ўсе ўдзельнікі выступілі з музычным нумарам, прысвечаным значнасці факультэта ў жыцці кожнага студэнта. З 20-годдзем, родны ФМА!

**????**

# Паказаць на што здольныя!

Да 20-годдзя ФМА быў прымеркаваны праект **«Тыдзень са студэнцкімі арганізацыямі»** – у межах якога былі праведзены розныя мерапрыемствы

Першымі пачала цешыць студэнтаў ***куратарская служба,*** кіраўніком якой з'яўляецца *Крысціна Галаш,* студэнтка 3 курса, і ***савет старастаў,*** які кіруе яе аднакурсніца *Ангеліна Юркова.* 22 верасня на 11 паверсе была арганізавана забаўляльная праграма з музыкай, пад якую можна было патанчыць і пазнаёміцца з новымі людзьмі, і гульнёй «Кракадзіл». Студэнты выкарыстоўвалі ўвесь свой прафесіяналізм, было цікава як адгадваць, так і паказваць. У якасці ўзнагарод раздавалі салодкія прызы: смачныя цукеркі і чупа-чупсы. У канцы ўсім падарылі шарыкі! А яшчэ зрабілі фота на памяць. Увогуле, мы пасмяяліся, паелі ласункаў, пазнаёміліся, зрабілі пару фота для Інстаграм... Дзень атрымаўся, ура!))

На наступны дзень мы разам адзначылі дзень нараджэння ***студэнцкага саюза БДУ,*** старшынёй якога сёлета стала студэнтка 4 курса спецыяльнасці «міжнародны турызм» *Марыя Мішар.* Дадзеная арганізацыя мае доўгую гісторыю: радуе факультэт ужо на працягу сямі гадоў! У сувязі з гэтым на 7 паверсе на вялікім перапынку мы арганізавалі мерапрыемства «Конкурсы і танцы з Аляксандрам Ачасавым»!

Вясёлы і яркі вядучы Аляксандр Ачасаў прымусіў усіх нас ад душы павесяліцца. Незвычайныя і вясёлыя конкурсы і не менш незвычайныя прызы: кубачкі з лагатыпам ФМА і бананы дасталіся самым годным і адважным удзельнікам.

Студэнты пажадалі студэнцкаму саюзу ФМА росквіту і больш ладзіць такіх вясёлых і незвычайных мерапрыемстваў!

24 верасня вялікі перапынак студэнты праводзілі з ***прафбюро ФМА.*** У праграме была вясёлая музыка, шумныя конкурсы, а таксама гонкі на скейтбордах. Усе пераможцы атрымалі памятныя прызы з сімволікай прафбюро. Пераможцу гонак на скейтбордах, якім стаў студэнт 2 курса Кірыла Бяльцоў, у якасці прыза была ўручана майка. Вялікае дзякуй арганізатарам, старшыні прафбюро ФМА *Аідзе Гуліевай* і яе намесніку *Марыі Гурко.*

25 верасня адбылася доўгачаканая сустрэча з новым студэнцкім згуртаваннем – ***«Суполкай аматараў беларушчыны ФМА».*** На вялікім перапынку студэнты мелі магчымасць пазнаёміцца з вытокамі суполкі, вынікамі праведзенай у мінулым семестры апытанкі, планамі і перспектывамі, а таксама скончылася душэўнымі спевамі пад гітару. Кожны ўдзельнік атрымаў зарад бадзёрасці і прыемныя падаруначкі. Мерапрыемства была праведзена лідарамі суполкі *Багданам Хмяльніцкім і Цімурам Хадзіным.*

26 верасня ва ўсіх студэнтаў ФМА была магчымасць паказаць сваю выдатную фізічную падрыхтоўку. Як усе мы ведаем, сапраўдны «ФМАшнік» павінен умець 3 рэчы: забаўляцца, нягледзячы ні на што; прыходзіць на пары пасля клуба, і,вядома ж, бегаць хутчэй усіх на 13 паверх! У сувязі з гэтым сёння прайшло вельмі важнае для кожнага «ФМАшніка» мерапрыемства: «Экстрэмальны забег Fire runner» з **БРСМ,** рухавіком якога на ФМА з'яўляецца *Дар'я Чупрова.*

Удзельнікі стартавалі з першага паверху і беглі на 13 паверх, дзе іх чакалі прыўкрасныя дзяўчаты, якія раздавалі ўдзельнікам энергетычны напой Red bull. Хочацца адзначыць, што ўсе ўдзельнікі ў роўнай ступені паказалі сваё майстэрства. Прадстаўніцы далікатнага полу спраўляліся нароўні з моцнымі! Дзяўчаты адважна пераадольвалі лесвічныя пралёты, аднак з невялікім адрывам пераможцам забегу стаў Стэфан Карасёў, які апярэдзіў свайго суперніка на 50 мілісекунд!

Праект «Выпрабавальнікі ўражанняў IMPRESSORS.BY» падараваў для пераможца сертыфікат ад падарункавага сэрвісу DAROO. Прыз уручаў намеснік дэкана ФМА Сяргей Карэлін, які адзначыў важнасць дадзенага мерапрыемства для факультэта, бо лесвіцы на ФМА былі тэмай для жартаў нават у старым корпусе на Акадэмічнай.

А ў дзень нараджэння факультэта, 1 кастрычніка, «Суполка аматараў беларушчыны ФМА» сумесна з бібліятэкай ФМА адкрыла ***секцыю буккросінгу.*** Дарэчы, Багдан Хмяльніцкі стаў пераможцам праекта Future FIR, прысвечанага збору ідэй па паляпшэнні жыцця факультэта, які праводзіцца *студэнцкай газетай «ФМОn-line»,* высунуўшы ідэю буккросінгу і паспяхова яе рэалізаваўшы.

Падводзячы вынікі ўсяго тыдня са студэнцкімі арганізацыямі, хочацца сказаць, што кожнае мерапрыемства пакінула след у сэрца кожнага «ФМАшніка». Дзякуй усім арганізатарам, якія стварылі святочны настрой на факультэце. Спадзяёмся, што студэнцкія арганізацыі працягнуць дарыць усмешкі і радасць студэнтам і далей!

Дзякуй усім, хто правёў гэты вясёлы тыдзень з намі! Са святам, любімы ФМА!

**Дар'я БОГДАН**

ВІНШУЕМ!

# Прафесар Таццяна Арлова – Чалавек-бясконцасць

Ці думалі Вы калі-небудзь пра тое, што такое бясконцасць? Як паспець дакрануцца да яе за адно зямное жыццё? У інстытуце журналістыкі БДУ віншавалі з 80-годдзем тэатральнага крытыка, прафесара і выкладчака кафедры літаратурна-мастацкай крытыкі **Таццяну АРЛОВУ,** чалавека-бясконцасць.



Таццяна Дзмітрыеўна вылучаецца сваёй абсалютнай разнастайнасцю як прафесійнай, так і асабістай. Гэта і навуковы дзеяч, і выкладчык, і тэатральны крытык і журналіст. Выкладчыкі Інстытута журналістыкі распавядаюць, што да яе можна заўсёды звярнуцца за жыццёвай парадай ды падрымкай, шчыра паразмаўляць па-жаночы, абмеркаваць моду (прафесар мае бездакорны густ).

Таццяну Дзмітрыеўну запрасіў выкладаць на факультэт Барыс Васільевіч Стральцоў. І заўсёды падтрымліваў, дапамагаў. Таццяна Арлова пачынала з прадмета марксіска-ленінскае вучэнне пра сябра. Яна прызнаецца: «Я вельмі моцна хвалявалася. Марксіска-ленінскае вучэнне гучала так нязручна. Я вельмі шмат рыхтавалася да кожнай лекцыі». Потым доўгі час знаёмства студэнтаў з прафесіяй пачынаецца менавіта з Таццянай Дзмітрыеўнай на прадмеце «Уводзіны ў журналістыку». Адна з яе вучаніц Ларыса Іванаўна Цімошык, сёння паспяховы журналіст газеты «Звязда», узгадвала пра тое, што для яе было вельмі важна пазнаёміцца з прафесіяй праз моцную, выбітную асобу. Зараз прафесар выкладае «Гісторыю мастацтваў», «Культуралогію», «Культуру і бізнэс», «Мастацтва ў кантэксце журналістыкі», спецкурс па профілі «Тэатральны крытык».

Да юбілея Таццяны Дзмітрыеўны супрацоўніца бібліятэкі Таццяна Ушакова падрыхтавала выставу ўсіх публікацый прафесара, якія былі ў фондзе бібліятэкі, сярод якіх арытыкулы ў прэсе, навуковыя матэрыялы і кнігі (больш за 20). Таццяна Мікалаеўна налічыла прыблізна 380 публікацый, каля паловы з іх навуковыя. Адзін з цікавых экспанатаў выставы – першая публікацыя Таццяны Арловай у газеце «Сталинаская молодежь» за 6 жніўня 1954 года. Артыкул называецца «Спектакль-сказка о Красной шапочке и ее друзьях». Каб зразумець і ацаніць гэтую тытанічную працу і яе аб'ём, трэба толькі прысці на выставу і падзівіцца, пачытаць, павучыцца. Тэатральны крытык і столькі б не стварыў, толькі журналіст. Фама Варанецкі, актор тэатра імя Янкі Купалы, пабачыўшы выставу Таццяны Дзмітрыеўны сказаў: «Вы разумная, што не пайшлі ў тэатр, а ў журналістыку. Слова і там, і там, але ж акторскае слова хутка забываецца, і не застанецца вазочак публікацый у бібліятэцы». Таму не здзіва, што дырэктар ФБ БДУ Уладзімір Кулажанка прысвоіў Таццяне Арловай званне ганаровага чытача бібліятэкі. Тым больш што прафесар некалькі разоў на тыдзень у зале перыёдыкі прачытвае ўсю прэсу.

Заўважна шанаванне Таццянай Арловай свайго бацькі Дзмітрыя Аляксеевіча Арлова, рэжысера, народнага актора БССР, выкладчыка Акадэміі мастацтваў. У 2004 г. выйшла кніга Т. Дз. Арловай «Учитель. Книга о Дмитрие Алексеевиче Орлове: Избранные статьи, воспоминания, документы». Першую сваю кнігу пра людзей і праблемы сучаснага тэатра і кіно «Ты і я» аўтар таксама прысвяціла памяці свайго бацькі. Гэта не лічачы артыкулаў у СМІ пра Дз. А. Арлова.

Таццяну Арлову шчыра віншавалі дырэктар Інстытута журналістыкі Сяргей Дубовік і выкладчыкі, вядомыя акторы тэатра, сярод якіх, Генадзій Аўсяннікаў, Таццяна Мархель, Бэла Масумян, Валерый Анісенка і вучні. З іх слоў і ўспамінаў пераконваешся, якія светлы, жыццясцвярджальны і шматгранны чалавек Таццяна Дзмітрыеўна. Яе любяць і калегі, і вучні, і тэатральны асяродак. Шмат хто падкрэсліваў прынцыповасць, прафесара, яе справядлівасць і імкненне падтрымаць таго, каму гэта патрэбна. У тэатры Таццяну Дзмітрыеўну паважаюць за дакладныя, канструктыўныя заўвагі, якія часта спрыяюць прафесійнаму станаўленню акторай і рэжысераў. Бэла Масумян узгадвала пра тое, як заўсёды акторы нацыянальнага беларускага тэатра чакалі рэцэнзій Таццяны Арловай. Калі яна доўга не пісала нічога пра тэатр, лічылі, што справы дрэнныя.

На юбілеі Т. Дз. Арловай гучала шмат слоў удзячнасці, любові і ўспамінаў. Таццяна Мархель узгадвала пра тое, што калі яна была на мяжы выключэння з Акадэміі мастацтваў будучую народную артыстку Беларусі не выключылі бо яе заўседы абараняў Аляксей Арлоў. Таццяна Мархель лётала як на крылах ад думкі, што яе заўважыў Аляксей Дзмітрыевіч.

Успамін Бэлы Масумян, пра якую Таццяна Дзмітрыеўна напісала кнігу «Инопланетянка» таксама вельмі светлы і кранальны. «Я вучаніца Дзмітрыя Аляксеевіча Арлова. Яго вучні заўседы ганарацца, што яны Арлоўцы. Найвялікшая пахвала, якая была ўмаім жыцці, гэта артыкул Дзмітрыя Аляксеевіча ў газеце «Советская культура» які называўся «Горжусь ученицей».

У Таццяны Дзмітрыеўны Арловай таксама ёсць адданыя прыхільнікі, якія любяць і шануюць свайго настаўніка. Адзін з іх нават пісаў лісты з арміі сваёй любімай выкладчыцы. Сярод вучняў Таццяны Дзмітрыеўны – Людміла Саянкова, загадчык кафедры літаратурна-мастацкай крытыкі, Ларыса Цімошык, журналіст газеты «Звязда», Арцём Кавалеўскі, паэт і выкладчык, Пятро Васючэнка, пісьменнік і шмат шмат іншых. Менавіта яна паўплывала сваімі станоўчымі рэцэнзіямі на прызнанне Генадзя Аўсяннікава і Таццяны Мархель.

Таццяна Арлова зараз працягвае актыўную тэатральную і выкладчыцкую дзейнасць. Шмат ездзіць на тэатральныя фестывалі Беларусі і замежжа, публікуецца, шмат размаўляе са студэнтамі на кафедры, разбіраючы ледзь не па радках іх артыкулы. Цяжка ўявіць сучасную беларускую тэатральную прастору і факультэт журналістыкі без Таццяны Арловай. Чалавек-бясконцасць здольны пражыць некалькі жыццяў у адной.

**Марына ЕЛІСТРАТАВА**

АСОБЫ

# Тапаніміка – гэта Рылюк

У кожнага з нас аб навучанні застануцца цёплыя ўспаміны. І хутчэй за ўсё гэта будуць вобразы сяброў і выдатных выкладчыкаў. Геаграфічны факультэт багаты на такіх асоб. 80 год таму нарадзіўся **Георгій РЫЛЮК** – выбітны беларускі тапаніміст і географ.

З гэтай нагоды кафедрай фізічнай геаграфіі свету і адукацыйных тэхналогій былі арганізаваныя адмысловыя навуковыя чытанні імя Г. Я. Рылюка. Напачатку была адкрыта выстава-прэзентацыя навуковых работ, дзе былі сабраныя амаль усе працы, выданні, падручнікі, кнігі, што былі напісаны прафесарам.

Арганізатары зрабілі акцэнт на правядзенні круглага стала, дзе прагучалі цёплыя словы пашаны і ўспаміны сяброў, калегаў, вучняў Георгія Рылюка.

Адкрываў сустрэчу прарэктар па вучэбнай працы БДУ А. Л. Толсцік «Унёскам такіх людзей ганарыцца ўніверсітэт. Самы галоўны здабытак – гэта людзі, што тут працуюць, і мы павінны на годнасці іх цаніць!» Пасля ўзяў слова намеснік дэкана па навуковай працы геаграфічнага факультэта С. І. Кузьмін «Рылюк быў выдатнейшым лектарам, педагогам, быў вельмі камунікабельным чалавекам і мне вельмі прыемна, што мы шануем такога чалавека. Шмат хто звязвае імя Рылюка з геафакам!»

Далей словы падзякі і пашаны паляцелі як птушкі ў вырай, усе выкладчыкі добра памяталі свайго Жору (Г. Я. Рылюка).

М. В. Кухарчык: « На мяне, як на чалавека паўплывалі 2 чалавекі – гэта мой бацька і Г. Я. Рылюк. Ён звяртаў вялізарную ўвагу на свае лекцыі, даходзіла да таго, што яго паслухаць прыходзілі нават студэнты мехмату! Я да сёння адчуваю благавейнасць, ён так займальна гэта рабіў, што мы сядзелі рот разінуўшы».

А. Я. Яротаў: «У вузкай атмасферы Рылюк прымудраўся казаць пра балцкія і літоўскія тапонімы. А гаворачы пра ВКЛ... Першы адзел пытаўся, чым яны там займаюцца? Гэта была неардынарная асоба. Ён збіраў кемлівых вучняў і ініцыяваў гульню «Вашае слова, Эрудыты!» на беларускім тэлебачанні. У пачатку 90-х прамаўляў па-беларуску, папулярызаваў нашу мову. І, увогуле, калі кажуць пра тапаніміку – то гэта Рылюк».

А. Г. Кальмакова: «Г. Я. Рылюк – мой настаўнік з вялікай літары, гэта быў мой любімчык, яго лекцый чакалі, не прыйсці на іх было сорамна. Ён усрпымаў студэнтаў, як жывых людзей, а не як масу. Рылюк казаў, што выкладчык можа называцца выкладчыкам толькі тады, калі ён любіць студэнтаў і свой прадмет».

У маёй памяці ёсць такі ўспамін: у школьныя гады рыхтаваўся да алімпіяды па геаграфіі і мая выкладчыца ледзь не на святочным рушніку давала пачытаць кнігу па геаграфіі Рылюка. Тады гэта было дзіўна для мяне, але цяпер я разумею. Глядзіце, прайшло амаль 10 год як няма Георгія Якаўлявіча, але памяць жыве да гэтага часу. Не пра кожнага чалавека ўзгадваюць нават і праз пяць год.

Г. Я. Рылюк (1935 – 2006) – нарадзіўся 6 сакавіка 1935 г. у в. Пікачы Драгічанскага раёна Брэсцкай вобласці. Скончыў геаграфічны факультэт БДУ у 1963 г., на якім пачаў працаваць з 1966 г. Навуковыя інтарэсы: рэгіянальная фізічная геаграфія і тапаніміка.

**Ягор ЛЕВАЧОЎ**

АБ'ЯВЫ

**БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ**
**АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАД:**

ПРАФЕСАРАЎ КАФЕДРАЎ: гісторыі беларускай мовы, міжнародных адносін,

ДАЦЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: бія– і нанамеханікі, тэарэтычнай і прыкладной механікі, нелінейнага аналізу і аналітычнай эканомікі, гісторыі беларускай літаратуры, класічнай філалогіі, банкаўскай эканомікі, інавацыйнага менеджменту, экалагічнага і аграрнага права, крыміналістыкі, дзяржаўнага кіравання, крымінальнага працэсу і пракурорскага нагляду, міжнародных эканамічных адносін, тэорыі і практыкі перакладу,

СТАРШЫХ ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: фізікі і аэракасмічных тэхналогій, вэб-тэхналогій і камп'ютарнага мадэлявання, класічнай філалогіі, інавацыйнага менеджменту, крымінальнага працэсу і пракурорскага нагляду, паліталогіі, фінансавага права і прававога рэгулявання гаспадарчай дзейнасці, раманскіх моў, германскіх моў.

*Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.*

*Адрас: 220030, г. Мінск, вул. Бабруйская,5-а, упраўленне кадраў, тэл. 209-54-36.*

НАШЫ ЮБІЛЯРЫ

**04 кастрычніка Шалькевіч Франц Емяльянавіч,** дацэнт кафедры геадэзіі і картаграфіі

**07 кастрычніка Долбік Алена Яўгенаўна,** дацэнт кафедры рускай мовы

**07 кастрычніка Сталеўская Святлана Мікалаеўна,** дацэнт кафедры матэматычнага мадэлявання і аналізу дадзеных

**09 кастрычніка Марцінкевіч Галіна Іосіфаўна,** прафесар кафедры геаэкалогіі

**10 кастрычніка Баравы Віталь Расціслававіч,** загадчык кафедры мовазнаўства і краіназнаўства Усходу

**13 кастрычніка Марозава Таццяна Анатольеўна,** загадчык вучэбна-навуковай лабараторыі беларускага фальклору

**14 кастрычніка Лявонцьеў Аляксандр Віктаравіч,** дацэнт кафедры фізічнай электронікі і нанатэхналогій

**17 кастрычніка Дзітчанка Таццяна Іванаўна,** дацэнт кафедры клетачнай біялогіі і біяінжынерыі раслін

**20 кастрычніка Мельнікава Алена Аляксандраўна,** дацэнт кафедры лазернай фізікі і спектраскапіі

**20 кастрычніка Дмітрук Наталля Міхайлаўна,** дацэнт кафедры метадаў аптымальнага кіравання

**22 кастрычніка Красоўскі Аляксандр Мікалаевіч,** дацэнт кафедры агульнага землязнаўства і гідраметэаралогіі

**25 кастрычніка Екадумава Ірына Іванаўна,** дацэнт кафедры сацыяльнай камунікацыі

**27 кастрычніка Галаўчанская Алена Эдуардаўна,** дацэнт кафедры інавацыйнага менеджменту

**31 кастрычніка Дакукава Наталля Анатольеўна,** дацэнт кафедры тэарэтычнай і прыкладной механікі

## БДУ Ў СМІ БЕЛАРУСІ

**Чатыры міжнародныя праекты ў рамках конкурсу адукацыйнай праграмы Еўрапейскага саюза «Эразмус+» «Стварэнне патэнцыялу ў сферы вышэйшай адукацыі» выйграў БДУ** – interfax.by, БелТА, радыё «Сталіца», 21.by, minsknews.by, kv.by, telegraf.by, ecopress.by,belarus.by, uaport.net, mod.mil.by (08.09).

**Школы юных пачалі працу ў БДУ** – megacat.by, hand-embroidered10.rssing.com (13.09), Радыё «Сталіца» (14.09).

**Першы фэст актыўнага ладу жыцця «BSU FEST–2015» адбыўся ў БДУ** – БелТА, megacat.by, радыё «Сталіца», Мінск ТБ (14.09), радыё «Сталіца» (16.09), hand-embroidered10.rssing.com (17.09), minsknews.by, БТ-1, 21.by, megacat.by, АНТ, СТБ (18.09), estu.by (25.09).

**БДУ ўмацаваў свае пазіцыі ў рэйтынгу найлепшых універсітэтаў свету па версіі ўплывовага брытанскага агенцтва QS (THE – QS World University Rankings)** – Tut.by, 21.by freesmi.by, bobr.by, talks.by radiominsk.by, БелТА, радыё «Сталіца», ej.by, 5min.by, soyuz.by, Telegraf.by, АНТ, interfax.by, normativka.by, belinform.org, zavtrasessiya.com, БТ-1, aif.by, megacat.by, hand-embroidered10.rssing.com (15.09), zviazda.by, «Звязда» (19.09).

**Ядомая ўпаковачная абгортка для цукерак прадстаўлена ў Белдзяржуніверсітэце** – hand-embroidered10.rssing.com, БелТА, радыё «Сталіца», mail.ru (21.09), Sb.by, БелаПАН, onliner.by, 21.by, kp.by (22.09), minsknews.by (23.09), «Знамя юности», «Народная газета» (25.09).

**Выстава «Мая Радзіма – Беларусь. Універсітэт у кантэксце дасягненняў» у БДУ** – 1 Нацыянальны канал Беларускага радыё, БелТА, радыё «Сталіца», БТ-1, АНТ, Мінск ТБ, СТБ, minsknews.by, unistar.by, so-l.ru, radiomir.by, megacat.by (21.09).

ПА ЗАМЕЖНЫ ДОСВЕД

# Як вывучыць кітайскія іерогліфы? Трэба практыка і цярпенне

Выкладчык журфака БДУ **Дар'я Гіргель** распавяла, як два гады працавала ў Хэнанскім універсітэце ў Кітаі.




??????????????????????



河南大學
HENAN UNIVERSITY
P.O.475001. Henan. Kaifeng. P.R.China 中国·开封
给父母的信
Хэнаньском
Я учусь в HeNan университете. Мне очень нравится искусство и русский язык. У нас класс 30 студенты. Мы дружественново сосуществвания. Мы вместе посещать занатия. Каждоы день я счастливый.
У общежитии 4 студентка. Они очень нищая, очень красивый. Мы часто вместе ходить в на уроке, в магазине. В субботу мы ходить на улице, покупать одежду, есть вкусный блюда, иногда мы вместе игрть в волан, гуляют в парке, танцевать на площать.
Я очень люблю мой университет, люблю моя общежития, моя подруга. Я живу хорошо.

??????????????????????

Кітай – гэта вельмі экзатычная краіна для студэнтаў і выкладчыкаў. Неяк так выйшла, што людзі ўяўляюць сабе стажыроўку за мяжой у Польшчы, Германіі, Францыі, Вялікабрытаніі, але ніяк не ў Кітаі. Аказваецца, што магчымасць патрапіць туды вельмі нават рэальная. Напрыклад, сёння ў Хэнанскім універсітэце вучацца маладыя філолагі з Беларусі. На 2016–2017 гады зараз фарміруюць групу студэнтаў БДУ. Гэта стала магчымым пасля нядаўняй сустрэчы кіраўнікоў універсітэтаў-партнёраў.

Так што ж гэта за краіна, Кітай, як туды патрапіць і, галоўнае, як там жыць і вучыцца, распавядае нам выкладчык Дар'я ГІРГЕЛЬ.

Дар'я Гіргель на радзіме працуе на кафедры літаратурна-мастацкай крытыкі Інстытута журналістыкі. У 2013 г. па праграме супрацоўніцтва паміж БДУ і Хэнанскім універсітэтам Дар'я паехала ў Кайфын выкладаць рускую мову як замежную. Калі дазваляў расклад, Дар'я наведвала курсы кітайскай мовы для замежнікаў.

– Калі я паведамляла блізкім, сябрам, што паеду працаваць на год у Кітай, у адказ часцей за ўсё чула словы здзіўлення, захаплення. Для мяне самой гэта было нечаканае рашэнне, пра якое я ні разу не пашкадавала. Улетку 2013 года я запісалася на курсы кітайскай для пачаткоўцаў, каб падрыхтаваць сябе, больш псіхалагічна, вядома, да таго, што такое кітайская мова. Сумлення скажу, што пры першым знаёмстве з іерогліфамі задумалася: «А ці можна іх наогул вывучыць? У чым сакрэт?». Пазней, ужо ў Кайфыне, пазнаёмілася са студэнтам з Румыніі, ён вельмі добра на той момант размаўляў па-кітайску, цяпер па стыпендыі кітайскага ўрада вучыцца ў аспірантуры ў Пекіне. Я яго спытала, як жа ён запомніў гэтулькі іерогліфаў, слоў. Яго адказам былі два словы – практыка і цярпенне.

Усяго Дар'я прапрацавала ў Хэнанскім універсітэце два навучальныя гады 2013/2014 і 2014/2015. Каб зразумець, што такое Кайфын і Хэнаньскі ўніверсітэт, можна паспрабаваць накласці гэта на беларускія рэаліі:

– Горад Кайфын – 5-8 мільёнаў жыхароў. Цэнтр правінцыі Хэнань, горад Чжэнчжоу – 13 мільёнаў. Сама правінцыя Хэнань – 94 мільёны. Для кітайцаў Кайфын – гэта невялікі горад. Як калі скажу, што я працавала ў Полацку.

Кайфын – гэта студэнцкі горад і адна са старажытных сталіц Кітая. Кайфын да таго археалагічна каштоўны, што ў яго гістарычным цэнтры забаронена будаўніцтва метро. У Хэнанскім універсітэце вучыцца каля 60 тысяч студэнтаў. Для параўнання ў БДУ 39 тысяч.

– Мяне не перастае здзіўляць, з якой стараннасцю ў Кітаі вывучаюць англійскую мову, пачынаючы ўжо з дзіцячага ўзросту. У кніжках для дзяцей казкі друкуюцца як на кітайскай, так і на англійскай мове. Я была сведкай таго, як сямігадовая дачка аднаго дзяржслужачага папрасіла вады. У Кітаі вам заўсёды будуць прапаноўваць гарбату ці ваду. Бацька строга сказаў ёй: «Папрасі па-англійску». Дзяўчынка задумалася. Бацька паказваў на шклянку з вадой, дамагаючыся правільнага адказу. Нашы выкладчыкі, магчыма, скажуць, што такога роду «дрэсіроўка» залішняя, шкодная для школьнікаў. Але, маючы зносіны з кітайцамі, я зразумела, што ў іх за працоўныя месцы вельмі вялікая канкурэнцыя, і веданне замежнай мовы асабліва вітаецца.

Маладыя кітайцы паступаюць у ВНУ па выніках іспыту ў школе. Дар'я распавядае, што для 99 % яе вучняў руская мова не была «жаданай», гэта значыць балы па выніках школьных іспытаў не дазвалялі ім «замахнуцца вышэй» і пачаць паглыблена вывучаць англійскую ці, напрыклад, нямецкую.

*– На пытанне «Чаму вы вывучаеце рускую мову?» студэнт адказваў: «Такі мой лёс». Цікава, што ў адказе не чулася ніякай іроніі. Гэта нагадвае мне кітайскую прыказку: «Задумвае справу чалавек, а здзяйсняе яе неба». Аднак, аднойчы вызначыўшыся з мэтай, кітайскі студэнт пачынае рупліва працаваць, каб потым стаць спецыялістам у абранай прафесіі.*

* * *

– Кітайцы прыязна-цікаўныя. Яны могуць цябе разглядаць, фатаграфаваць. Пра сябе мне часта даводзілася чуць, што я вельмі высокая і што ў мяне белая скура. Часта можна пачуць «Hello!», асабліва ад дзяцей. Бывае, што кітайскі студэнт мае зносіны з замежнікам, каб папрактыкавацца ў гутарковай англійскай, да таго ж гэта нейк індывідуалізуе яго ў агульнай масе студэнтаў.

* * *

Аднойчы ў сталовай я пазнаёмілася са студэнтам. Яго нямецкае імя Ёханэс (кітайцы выбіраюць сабе імёны той замежнай мовы, якую яны вывучаюць). Ён выдатна размаўляў на англійскай. Пра сябе распавёў, што вучыць нямецкую мову для таго, каб у будучыні паехаць вывучаць мікрабіялогію ў Германію. Іншы студэнт, яго рускае імя Антон, адначасова вывучаў дзве спецыяльнасці – рускую мову і міжнароднае права. Мы праходзілі тэму «Мой вольны час». На традыцыйнае пытанне «Што ты любіш рабіць у вольны час?», Антон адказаў: «Я не магу жыць па сваёй мары». А марыць ён пра вандраванні, цяжка дасягальныя ў першую чаргу з прычыны недахопу часу. Як правіла, менавіта такія старанныя кітайскія студэнты паступаюць у магістратуру, аспірантуру, едуць вучыцца за мяжу. Часам я запісвала за кітайскімі студэнтамі іх адказы, фразы з сачыненняў. Напрыклад: «Я хачу невялікі прагрэс кожны дзень», «Для паляпшэння якасці жыцця і дасягнення мэты трэба скласці расклад». Адзін студэнт наракаў: «Я не магу працаваць высокапрадукцыйна».

***– Гэта хутчэй выключэнне, ці гэта агульная карціна?***

– Не магу сказаць, што агульная карціна. Ёсць, вядома, і звычайныя студэнты, якія прапускаюць заняткі, не заўсёды робяць хатняе заданне. Але, як правіла, у кожнай групе ёсць старанныя студэнты. Раніцай набліжаешся да навучальнага корпуса, і ўжо здалёку чуеш гуд – гэта студэнты паўтараюць уголас хатнія заданні. У Кітаі падыход да вучобы традыцыйны: каб вывучыць іерогліфы, трэба запамінаць парадак рысак. Адвольнасць у напісанні, адступленне ад нормы не тое каб не вітаецца, а пра гэта нават не думаецца. Звычайна замежныя выкладчыкі адзначаюць добрую памяць кітайскіх студэнтаў. Але завучванне на памяць не спрыяе развіццю крытычнага мыслення. Таму толькі цяпер у кітайскіх універсітэтах пачынаюць уводзіць курс, які на Захадзе завецца criticalthinking. У працы з кітайскімі студэнтамі адбіваецца калектывісцкі тып мыслення. Як напісала адна студэнтка: «Мы часта робім усё разам». Цікава, што кітайскія студэнты ахвотна падказваюць адзін аднаму, у адрозненне ад еўрапейскіх ці амерыканскіх студэнтаў. Кітайцы ўмеюць так сябе паводзіць, каб у непрыемнай для іх сітуацыі не «страціць твар». У кітайскай культуры ёсць адмысловае слова, якое выказвае сацыяльныя сувязі, адчуванне таварыства, роднасці, – «гуансі». Памятаю, у адной групе студэнт Барыс заўсёды падказваў тым, хто выходзіў пісаць словы на дошцы. Нават пасля таго, як я яму зрабіла не адну заўвагу, Барыс адказаў: «Ён мой сябар».

* * *

Усе кітайскія студэнты-першакурснікі абавязкова праходзяць ваенную падрыхтоўку. Усе – і дзяўчаты таксама. Назірала, наколькі сур'ёзна яны да гэтага ставяцца – штодзённыя пастраенні, маршаванні, узняцце сцяга КНР, змена варты. Запомнілася з сачынення: «На маёй радзіме заўсёды сонечнае надвор'е». Кітайскія студэнты сапраўды патрыёты, ганарацца тым, што яны кітайцы.

***– Пры гэтым так капіюють Англію?***

– Кітайцы наогул майстры ў тым, што тычыцца капіявання... Ёсць мода на англійскую мову, еўрапейскае, амерыканскае. Напрыклад, яны адзначаюць Каляды 25 снежня, але, вядома, па-свойму – дораць адзін аднаму прыгожа запакаваныя яблыкі. Яблык па-кітайску сугучны са мірам, спакоем, дабрабытам.

***– Давайце пагаворым пра ўмовы. Хто за што плаціў? І якія там умовы?***

– Хэнаньскі ўніверсітэт аплачвае пералёт, дае бясплатнае жыллё. Усё, як прапісана ў дамове пра супрацоўніцтва паміж БДУ і Хэнанскім універсітэтам.

***– Якая заработная плата?***

– Камерцыйная таямніца, – загадкава ўсміхнулася Дар'я. – Будзеце выкладчыкам – даведаецеся. На жыццё, вандраванні хапае. Першы год я жыла ў інтэрнаце для кітайскіх выкладчыкаў. На другі год мне далі кватэру. Заняткі па рускай мове (20 акадэмічных гадзін у тыдзень), курсы кітайскай мовы, хатнія заданні – і вольнага часу застаецца не так шмат. У кітайскіх студэнтаў ёсць вялікі перапынак на абед з 12.00 да 14.30. У гэты час кітайцы, як правіла, адпачываюць, у іх дзённы сон. Калі кітайскія студэнты даведваюцца, што ў Расіі і ў Беларусі гэта не прынята, яны шчыра здзіўляюцца.

***– А дзе ж яны спяць?***

– У інтэрнатах. Навучальныя карпусы і інтэрнаты побач.

Умовы для студэнтаў будуць троху адрозніваць. На наступны год кітайскі бок можа прыняць да 20 навучэнцаў з БДУ. Пражыванне, вучоба бясплатна. За пералёт студэнты плацяць самі. У маі 2016 года канчаткова стане вядома, ці вылучаць студэнтам БДУ стыпендыі. Рашэнне прымае Міністэрства адукацыі КНР. Верагоднасць станоўчага адказу 80-90 %. Наогул, у Паднябеснай вельмі цікавая філасофія прыняцця рашэнняў. Слухаем Дар'ю:

***– У іх таксама бюракратыя?***

– У іх шмат папер. У Кітаі распаўсюджаны інстытут пасярэдніцтва, гэта значыць пры рашэнні любога пытання спачатку трэба звярнуцца да пасярэдніка, які перадае вашу просьбу свайму начальніку. Усё вельмі-вельмі павольна. Ужо жывучы ў Кітаі, я пачала шукаць інфармацыю, як разумець кітайцаў. Магу параіць студэнтам, якія паедуць у Кітай, кнігу Аляксея Маслава «Назіраючы за кітайцамі. Утоеныя правілы паводзін». Шчыра скажу, чытала, канспектавала, перачытвала. Аўтар на розных прыкладах тлумачыць, што ў Кітаі нішто не робіцца проста і адразу, і калі ў вас няма цярпення і вытрымкі, то лепш падумаць, ці варта вам ехаць у Кітай. Хачу падзяліцца адной з улюбёных кітайскіх прыказак: «Бывае толькі няправільны шлях, але не бывае бязвыхаднага становішча». Выйсце заўсёды ёсць, застаецца знайсці правільны шлях.

* * *

Адзін кітаец (ён добра ведае рускую мову) даваў мне сапраўды неацэнныя парады, якія зводзіліся да двух слоў «Сядзі і чакай». Калі ў мяне нейкая праблема, яе трэба вырашыць, самыя правільныя паводзіны ў такой сітуацыі будзе. Першае – прыйсці ў офіс. Другое – спакойна выказаць сваё пытанне. Трэцяе – чакаць і не сыходзіць з офіса, пакуль не пачуеш пэўны адказ. Гэта якраз той выпадак, калі спачатку звяртаешся да пасярэдніка, а ён ужо звязваецца са сваім начальнікам. Але калі сыдзеш адразу, то кітайцы палічаць, што рашэнне праблемы не так для цябе важна, і адкладуць яго ў доўгую скрыню.

* * *

***– Чуў, што ў Кітаі дрэнная экалогія. Гэта адчуваецца?***

– Вядома, праблемы з экалогіяй ёсць. Калі прыязджаеш у Кайфын, то першае адчуванне, што ўвесь горад у пыле. Многія кітайцы ходзяць з маскамі на тварах. Маску яны носяць у чатырох выпадках: хвароба, халоднае надвор'е, забруджванне паветра і проста даніна модзе. Пасля двух гадоў, праведзеных у Кітаі, асабліва пачынаеш шанаваць зялёныя паркі Мінска і сіняе неба над галавой. Асобна можна згадаць праблему з пітнай вадой. У Кітаі не рэкамендуецца піць ваду з-пад крана. Таму куплялі бутыляваную ваду. Проста да гэтага прывыкаеш.

***– З інтэрнэтам праблемы ёсць?***

– Блакуецца YouTube, Facebook, Gmail не адкрываецца. «УКантакце» працуе спраўна. Я люблю спампоўваць фільмы, таму перад паездкай троху турбавалася, ці будзе ў мяне такая магчымасць у Кітаі. Вырашыла падстрахавацца, і яшчэ дома ў Мінску запісала фільмы на вонкавы дыск. Але, апынуўшыся ў Кітаі, пераканалася, што ў гэтым не было неабходнасці.

Дар'я не хавае захаплення. Як гэта ні цяжка – выпасці з жыцця тут амаль на два гады і прывыкаць нечае жыццё там, яна ні пра што не шкадуе:

– Гэта lifechangingexperience. У дачыненні да Кітая, вывучэння кітайскай мовы мне ўспамінаюцца словы Уладзіміра Малявіна, аднаго з найлепшых кітаязнаўцаў у свеце, – «чым цяжэй, тым цікавей». Тым студэнтам, якія прынялі рашэнне пазнаёміцца з Кітаем бліжэй, хочацца сказаць, што баяцца сапраўды не трэба, а весела, з адкрытым сэрцам ісці наперад. Як вядома, дарога ў тысячу пачынаецца з першага кроку. Спадзяюся, што гэтай дарогай пойдуць самыя адважныя.

**Размаўляў Віталь АРЭШКА**

МАЙСТЭРНЯ

# Квітнець і знаходзіць новыя таленты!

**Клуб аматараў мастацкага слова «КЛУмБа»** святкуе сваю першую гадавіну! Гэта падзея адбылася 30 верасня ў зале інфармацыйных рэсурсаў па навуцы і мастацтву Фундаментальнай бібліятэкі БДУ.



За год свайго існавання маленькі паэтычны гуртох з гучным дэвізам «Заклікаем да сябе ўсіх апантаных добрым мастацкім словам, на якой бы мове яно ні гучала» ператварыўся ў сапраўдны літаратурны клуб, які аб'ядноўвае студэнтаў універсітэта самых розных факультэтаў. На працягу года мы пісалі вершы, складалі і спявалі песні, разам адзначалі святы, праводзілі літаратурныя конкурсы і вечары, хадзілі ў паход, а галоўнае – мы пасябравалі. І я вельмі рада, што стала часткай гэтай дружнай літаратурнай сям'і. Свой першы дзень нараджэння клуб аматараў мастацкага слова вырашыў адзначыць ўрачыста і весела. Толькі пераступіўшы парог бібліятэчнай залы, кожны ўдзельнік для паднятця настрою атрымаў салодкую кветачку, якую напрэрадзілі сваімі рукамі зрабілі для гасцей клубаўцы і супрацоўнікі бібліятэкі, а таксама значок клуба – на памяць.

Усё свята складалася з трох частак. У першай часцы прагучалі віншаванні клуба мэтраў беларускай літаратуры – Міхася Пазнякова, Анатоля Зэкава і Уладзіміра Навумовіча. Усе яны неаднойчы бывалі ў якасці жаданых гасцей на пасяджэннях «КЛУмБы», рэдагавалі і дапамагалі надрукаваць нашы творы ў айчынных часопісах. Карацей, добра знаёмы з нашай вясёлай і творчай арганізацыяй і яе ўдзельнікамі.

А некаторыя з ўдзельнікаў за гэты год таксама сталі знакамітымі асобамі. Напрыклад, Таццяна Купрыянец, сёлетняя выпускніца фізічнага факультэта, у якой гэтым летам выйшаў паэтычны зборнік пад назвай «Отзвуки памяти». На нашым свяце прайшла прэзентацыя яе першай кніжкі.

Таццяну асабіста і ўсіх клумбаўцаў разам павіншавалі дырэктар ФБ БДУ Уладзімір Кулажанка, загадчыца аддзела навукова-метадычнай работы Вольга Бальнова, а таксама Любоў Даніленка, намеснік кіраўніка літаратурнага аб'яднання «БУКет», якое ўжо не першы год існуе пры БДУКіМ. Яны пажадалі «КЛУмБе» квітнець, знаходзіць новыя таленты і расці з кожным годам больш і больш.

У другой частцы вечара клумбаўцы пад кіраўніцтвам свайго руплівага садоўніка старшыні клуба Ірыны Шкіронак паказалі тэатралізаванае прадстаўленне, пад час якога «КЛУмБа» «ажыла». Яе жыхары, у ролі якіх выступілі актыўныя ўдзельнікі клуба, а гэта Кацярына Роўда, Ігар Пятровіч, Аліна Масалава, Кірыл Тондзель, Таццяна Купрыянец, Анастасія Каротчыкава, Анастасія Трэшчава, Юрый Калабкоў і Аліна Карпіцкая праз вершы і песні раскрылі свае літаратурныя і артыстычныя здольнасці. Такім чынам яны пазнаёмілі са сваёй творчасцю тых гасцей, хто ведаў удзельнікаў клуба завочна, ці прыйшоў на «КЛУмБу» упершыню.

Кульмінацыяй прадстаўлення стала песня Кацярыны Роўда, якая пасля ўрачыстага выканання ўсімі прысутнымі набыла тытул і назву «Гімн КЛУмБы».

Трэцяя частка свята была самая смачная, бо прайшла яна ў кавярні «Хрызантэма», якую падрыхтавалі для нас супрацоўнікі бібліятэкі. Сталы патаналі ў кветках, яблыках, вінаградзе, апетытных бутэрбродах, салодкіх прысмаках. А ў цэнтры ўсяго гэтага быў вялікі найпрыгожы імянінны торт з выявай кнігі, пяра, а таксама розных кветак, пчолак, матылькоў і г.д. Вакол яго мы весела вадзілі карагод пад цудоўную музыку, якую выконваў для нас на саксафоне выдатны клумбаўскі музыка Ілья Візер.

У гэты вечар яшчэ доўга гучала музыка, чыталіся вершы, спявалі, вяліся сяброўскія размовы, працавалі дзве тэматычныя фотазоны: «Кніжная Вянецыя» і «Назад у СССР», на якіх кожны жадаючы мог сфатаграфавацца ў адпаведным антуражы з неабходным рэквізітам.

Усе разыходзіліся ў цудоўным настроі і жаданні абавязкова прыйсці на чарговы слёт клумбаўцаў, бо другі творчы сезон нашага неверагоднага літаратурнага аб'яднання ўжо адкрыўся!

**Аліна КАРПІЦКАЯ**




СТУДЭНЦКІ ІНТАРЭС

*Валянцін КІРЫК пра BSU Fest–2015:*

# «Мы дамагліся патрэбнага эфекту»

**Адгучалі салюты БДУ-фэста, але не скора сціхнуць размовы, бо ўражанняў хопіць на цэлы год.** Валянцін Кірык, студэнт 3-га курса ФСК, расказаў пра падрыхтоўку, «напружанку» і планы.



*Валянцін Кірык на БДУ-фэсце*

Між іншым, Валянцін не проста арганізатар ці валанцёр, ён галоўны рэжысёр і аўтар праекту. Сустрэліся мы каля галоўнага корпуса БДУ, дзе ён спаткаўся з іншымі членамі прафсаюза. Напэўна, абмяркоўвалі новую імпрэзу?

***– Што падштурхнула да стварэння такога грандыёзнага мерапрыемства?***

– Ідэя нарадзілася ў пачатку 2015 года. На маім факультэце ёсць нешта тыпу турзлёту, які праводзіцца ў канцы мая. Я падумаў, што было б цікава правесці такое ж масавае, задорнае, спартыўнае для ўсяго БДУ. А маёй марай было зрабіць малыя Алімпійскія гульні. Вось калі гэтыя два жаданні аб'ядналіся, ставарылася канцэпцыя. Заставалася знайсці пляцоўку. Тут я і ўспомніў, што 3 гады таму адпачываў у лагеры «Лідар». Яго кіраўніцтва нам не адмовіла.

***– БДУ–фэст стаўся такім разнабаковым. Якая ж галоўная мэта?***

Задума фестывалю была ў тым, каб зрабіць нешта бадзёрае для студэнтаў, супрацоўкаў, і наогул усіх, хто цікавіцца БДУ. Жыццё ў нашай альма-матар – гэта не толькі вучоба, але творчасць (танцы, песні, рукадзелле) і спорт. Хацелася паказаць, што моладзь рознабакова развітая. Гэта тое мерапрыемства, якога ніколі не было раней, і якое будзе задаваць тон на будучыню. Мы гэта зрабілі самі – студэнты для студэнтаў. А значыць, добра ведалі, што будзе сапраўднаму цікавым. Таму канцэрт атрымаўся самым лепшым: прадумана мноства дэталяў, маленькіх фішачак. Хацелі запрасіць Дар'ю Домрачаву, але яна не змагла, таму што была на зборах. Але прыехалі Любоў Чаркашына, Дзяніс Магер, Аляксандра Наркевіч. У аргкамітэце спартсменаў, акцёраў, валанцёраў налічвалася 293 чалавекі.

***– Здаецца, праект прыдумалі і стварылі літаральна за два тыдня…***

– Насамрэч, фестываль рыхтаваўся сто дзён. Так, актыўна дзейнічаць пачалі з верасня. Але мы працавалі на працягу ўсяго лета. Знайшлі спонсараў, партнёраў, паклікалі знакамітых артыстаў і спарстменаў. Былі нават прапановы запрасіць на адкрыццё прэзідэнта краіны!

***– А як жа адпачынак?***

– Фактычна яго не было. А за тыдзень да фестывалю я спаў па 2 гадзіны і еў максімум адзін раз на дзень. Хачу падзякаваць прафсаюзу, тым хлопцам і дзяўчатам, якія дапамаглі стварыць свята. Як было прыемна чуць, што ўсе прысутныя задаволены канцэртам, спартыўнымі гульнямі, сябаборніцтвамі! Адчувалася аддача залы, мы дабіліся патрэбнага эфекту. Дзеля такога і хочацца дзейнічаць.

***– Што аказалася самым складаным пры падрыхтоўцы?***

– Мабыць, супрацоўніцтва з артыстамі. Звычайна танцоры і спевакі прыходзяць з гатовымі нумарамі, распрацаванымі загадзя. Здараецца і такое, што з адной праграмай могуць выступаць на некалькіх канцэртах. А зараз мы збіраліся адзін-два разы на тыдзень, разам ставілі харэаграфію, прадумвалі дэкарацыі. Такім чынам, кампазіцы былі зусім новымі, на іншых сцэнах не паказваліся.

Дарэчы, калектывы, што выступалі на працягу дня, хай і не цалкам належалі БДУ, але іх ўдзельнікамі абавязкова былі менавіта навучэнцы нашага ўніверсітэта. Ролеры, скейт-бардзісты, нават некаторыя працаўнікі кампаніі «рэд бул» вучацца ва ўніверсітэце.

***– Ці ёсць планы на наступную восень?***

– Фестываль атрымаў высокую адзнаку, таму ўжо разважаем над чарговай праграмай. Канешне, у другі раз БДУ-фэст праводзіць будзе менш праблематычна, партнёрам ёсць што паказаць, а добрыя водгукі прывядуць людзей на малыя Алімпійскія гульні і канцэрт. Думаем паклікаць кампанію велкам, каб быў бясплатны вай-фай. Марым запрасіць артыстаў з-за мяжы.

**КАМЕНТАРЫІ**

**Надзея Анісовіч**

– На БДУ-фэст я прыехала толькі на канцэрт. Ён атрымаўся яркім. Прыемна, што на сцэне выступалі як знакамітыя беларускія артысты, так і студэнты ўніверсітэта. Было шмат знаёмых асоб. Па водгуках маіх сяброў, днём там было не менш цікава. Мне здаецца, раней у БДУ не было падобных масавых спартыўна-забаўляльных мерапрыемстваў і хацелася б ператварыць гэты фэст у традыцыю. Ён паказвае, што ўніверсітэцкае жыццё – гэта не толькі вучоба, але і спорт, і забавы.

**Алена Агароднік**

– Пасля «Віват, студэнт!» гэта было другая эмацыянальна насычаная падзея ў БДУ з пачатку новага навучальнага года. Я непасрэдна ўдзельнічала ў гэтым грандыёзным свяце ў якасці валанцёра. Незабыўныя ўражанні, пазітыўныя эмоцыі, новыя знаёмствы – усё тое, чым быў прасякнуты дзень festa. Хачу сказаць вялікі дзякуй арганізатарам такога маштабнага мерапрыемства, а асабліва галоўнаму рэжысёру Валянціну Кірыку. Спадзяюся, БДУ-fest стане выдатнай традыцыяй нашага ўніверсітэта.

**Кайсар Рахіл**

– Усё было класна арганізавана! Бясплатная вада, вялікая колькасць розных крэслаў, канапак-арэляў, навесаў… Шматлікія конкурсы з прызамі, футбол і тэніс, валейбол—тое, што адразу кінулася ў вочы. А мімы стварылі настрой і атмасферу нечага дзівоснага!

**Таццяна МОРАВА**

?????????
????????
?????????

ШКОЛА АКТЫВУ

# Старасты ў вобразе

Вы калі-небудзь задумваліся над тым, што магло б аб'яднаць такія вядомыя серыялы, як Sherlock, The Simpsons, «Брыгада», «Клон» і Power Rangers? Нават выказаць здагадку не можаце? Не дзіўна! Вы не былі на 9 выязным адукацыйным семінары для старастаў навучальных груп 1 курса **«Ты староста».**







Выдалася пахмурна-дажджлівая раніца. Гуд матораў аўтамабіляў, якія спяшаюцца і раствараюцца за гарызонтам, перарываўся грукатам колаў валізак і поўнымі спадзяванняў і чакання размовамі. У той момант наўрад ці хто-небудзь з першакурснікаў усведамляў усё хараство і значнасць гэтай паездкі. Ніхто і выказаць здагадку не мог, якім неацэнным досведам у іх студэнцкім жыцці стане семінар. А загадкавыя ўсмешкі арганізатараў толькі падлівалі масла ў велізарнае полымя цікаўнасці.

Многія лічаць, што староста – гэта звычайны студэнт. Можа, трохі больш адказны, чым астатнія. І не больш за тое. Але мала хто задумваецца пра тое, што іх праца – велізарная па аб'ёме, які здолее не кожны. Неабходна збіраць, падпісваць у дэканаце, афармляць процьму папер, весці часопіс наведвальнасці і трымаць справаздачу перад куратарам групы. А калі своечасова ўсё не зробіш – гузы валяцца на тваю галаву. Як справіцца з той адказнасцю, якая ўскладаецца на твае плечы? Як у самых складаных сітуацыях не ўпасці ў бруд тварам? Гэта далёка не ўсе пытанні, з якімі сутыкаюцца новаспечаныя «старэйшыны» груп. Арганізатары, улічваючы гэта, паспрабавалі разнастаіць мерапрыемства цікавымі майстар-класамі, лекцыямі і трэнінгамі. Хутчэй, не для таго, каб бяздзейна прабавіць час і павесяліцца. Галоўная задача – перадаць досвед і ўменні, якімі валодаюць «дзядкі» з адной толькі мэтай: зрабіць з маладняку сапраўдных суперстарастаў.

За некалькі тыдняў да афіцыйнага старту каманды ад розных факультэтаў былі падзелены па камандах. Выніковы спіс выглядаў наступным чынам: ФПМІ+ДІКСТ (Лук'янава Яна), фізічны факультэт+ФМА (Храмцоў Эдгар), хімічны + юрыдычны факультэты (Брадовіч Антаніна), ФФСН+МДЭІ імя А. Д. Сахарава (Самалазаў Павел), ІЖ+эканамічны факультэт+юрыдычны каледж (Віцюгова Вікторыя), ММФ+геаграфічны факультэт (Крыжаноўская Яўгенія), РФКТ+ФСК (Гедымін Віталь), філалагічны+гістарычны факультэты+Інстытут тэалогіі (Ціханава Нэлі), ІБМТ+біялагічны факультэт (Ждановіч Дар'я). Выбуханебяспечнае спалучэнне, не знаходзіце? Куратары каманд, якія на час замянілі дзецям мам і татаў, братоў і сясцёр, сяброў і сяброўак, перахапілі ініцыятыву ў свае рукі, пазнаёмілі студэнтаў адзін з адным, пазнаёміліся з імі самі, згуртаваліся ў адзіную непераможную каманду і прыступілі да працы. Усяго за некалькі дзён неабходна было паставіць творчы нумар, агучыць фрагмент з фільма, падрыхтавацца да спартыўных і інтэлектуальных спаборніцтваў.

Заезд у «Брыганціну» абяцаў толькі адно: сумна не будзе нікому! Ужо праз пару хвілін комплекс напоўніўся шумам крычалак, песень і выдатным настроем. Кожны калектыў дэманстраваў свае разыначкі, каб з першых жа хвілін заявіць пра лідарства. Толькі ўявіце сабе, каманда «Футурама» лётала на ракеце!

Праграма выдалася насычанай. У першы дзень адбыўся матч па валейболе рэктарата з першакурснікамі, прэс-канферэнцыя з удзелам старшыні Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Генадзем Пальчыкам і рэктарам БДУ акадэмікам Сяргеем Абламейкам. Хлопцы і дзяўчаты прынялі ўдзел у працоўных секцыях, прыгодніцкай гульні «Сутычка» і ролевай гульні «Бітва характараў». Сапраўдным падарункам для ўсіх стаў караоке-клуб «Староста, які спявае». Падвёўшы вынікі на рэфлексіі, каманды адправіліся спаць.

Уздым, зарадка, сняданак – бягом па справах. Раніца другога дня пачалося. Апроч прац навучальных секцый, удзельнікаў чакала прэзентацыя дзейнасці псіхалагічнай службы БДУ, дыскатэка «Танчы, пакуль малады!», дзе адбылася танцавальна-гульнявая прэзентацыя камандаў. І, вядома ж, творчы вечар «Клуб вясёлых старастаў». У зале панавала атмасфера барацьбы і рызыкі. Адзіны шанец даказаць, што ты найлепшы. Крыкі заўзятараў рэхам урываліся ў мітусню, даводзячы градус запалу да мяжы. Усе разумелі: няма права на памылку. Ззаду бяссонныя ночы, велізарная колькасць гадзін падрыхтоўкі. Не дзіва, што каманды рэпетавалі ў калідорах, на вольных пляцоўках, у карпусах і нават у чаканні вячэры пры сталовай. Усё гэта станавілася нейкім імпульсам, дапамагала ў выступленні.

Галоўная інтрыга захоўвалася

ДАЛУЧАЙЦЕСЯ!

**Гудзенне натхнёных першакурснікаў** было чуваць ужо на аўтобусным прыпынку, а ўсё таму, што ў мінулую суботу ў Гаі прайшоў Кубак першакурсніка БДУ!



# Кубак першакурсніка–2015

13 каманд змагаліся за званне самых творчых, самых кемлівых і самых спартыўных студэнтаў БДУ. Студэнтам трэба было пераадолець спартыўную і творчую часткі спаборніцтва.

Спартыўны этап мерапрыемства быў прадстаўлены турыстычнай паласой перашкод, што стала выдатнай магчымасцю праверыць згуртаванасць удзельнікаў кожнай з каманд. Арганізатары правялі мноства пікетаў, у якіх студэнты прадэманстравалі каманднае майстэрства. Першакурснікі прайшлі 15 этапаў, якасць і хуткасць пераадолення якіх прынеслі камандам запаветныя балы і наблізілі да каштоўнага трафея. Хлопцы і дзяўчаты паспрабавалі сябе ў якасці скалалазаў, прадэманстравалі свае навыкі ў дартсе, а таксама паказалі сваю дасціпнасць і пачуццё гумару.

Далей ішоў невялікі перапынак. А перапынак удзельнікі правялі за смачным абедам. Што можа быць лепшым, чым гарачая каша з тушонкай і шкляначка цёплага чаю?

Але самая ўражлівая і атмасферная частка мерапрыемства чакала пазней. Каманды праявілі сябе ў творчым нумары, прысвечаным тэме «Я студэнт БДУ». Якіх толькі персанажаў там ні было! І курсант ваеннага факультэта, і сакратар БРСМ БДУ, і нават Аляксандр Саладуха!

Каманды выступалі цудоўна, аднак бесстаронняе аб'ектыўнае журы на чале з А. П. Багамазавым усё ж вылучыла тройку найлепшых. Па выніках конкурсу самай смешнай, самай дасціпнай, самай дружнай, самай творчай і самай спартыўнай стала каманда факультэта сацыякультурных камунікацый!

Мы ад шчырай душы віншуем пераможцаў! А ўсіх першакурснікаў запрашаем супрацоўнічаць з намі!

**Станіслаў ПІНЧУК**

ІНІЦЫЯТЫВЫ

# Самакіраванне: досвед і перспектывы развіцця

На базе БДУ 28–29 верасня сабраліся студэнты з розных краін.

У Год моладзі Міністэрства адукацыі РБ, а таксама грамадскі рэспубліканскі студэнцкі савет (ГРСС) пры міністру адукацыі сталі ініцыятарамі правядзення I міжнароднай канферэнцыі «Студэнцкае самакіраванне: перспектывы развіцця».

– Канферэнцыя дае магчымасць наладзіць сувязі, абмен досведам. Да нас прыехалі госці з Казахстана, Расіі і Грузіі, – патлумачыў старшыня ГРСС Яўген Харук.

Сама канферэнцыя праходзіла вельмі насычана. У першы дзень выступілі намеснік міністра адукацыі Віктар Якжык, начальнік упраўлення па справах моладзі міністэрства адукацыі Наталля Пшанічная, а таксама першы прарэктар Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце РБ Аляксандр Іваноўскі, дацэнт кафедры моладзевай палітыкі і сацыякультурных камунікацый РІВШ Андрэй Салікаў, якія распавялі пра кірункі працы студэнцкага самакіравання Беларусі.

Дапамогу ў правядзенні мерапрыемства аказалі таксама БДПУ, БДЭУ, БДУІР, РІВШ, на якіх былі праведзены секцыі: студэнцкае самакіраванне ў адукацыйнай і інфармацыйнай прасторы, інавацыйныя формы працы, студэнцкі лідар. Актывісты падзяліліся ідэямі, а таксама распавялі пра тое, як рэалізуецца моладзевая палітыка ў іх установах вышэйшай адукацыі.

Па выніках працы была распрацавана канцэпцыя студэнцкага самакіравання ў Беларусі.

Знакавай падзеяй стала сустрэча ўдзельнікаў канферэнцыі з Міністрам адукацыі Беларусі Міхаілам Жураўковым у фармаце «адкрытага дыялогу».

Вось так запомнілася канферэнцыя ўдзельнікам, якія былі вельмі ўдзячныя, і чакаюць наступнага разу, каб ізноў сустрэць сваіх сяброў і падзяліцца свежымі задумамі.

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
Выданне зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 1082 ад 21 студзеня 2010 года

9 кастрычніка 2015 года
Падпісана да друку 8.10.2015 г.
Зак. ___. Тыраж 1000 экз.
Надрукавана ў РУП «Выдавецкі цэнтр БДУ»
ЛП № 02330/117 ад 14.04.2014.
220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6

**Рэдактар Сяргей Сяргеевіч ШАФАЛОВІЧ**
Карэктар Ганна Яўгенаўна РАК
Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, прасп. Незалежнасці, 4
Прыёмная: вул. Кальварыйская, 9, каб. 102, тэл. 259-70-77,
***e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by***